КУЛЬТУРА

"ЗА ДУХОЎНАЕ АДРАДЖЭННЕ" ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ ПРЭМІЯ

WWW.KIMPRESS.BY
ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА
1991 г. / № 6 (1341)
10 лютага 2018 г.

Актуальныя задачы галіны: прагноз, планаванне, запатрабаванасць

Калегія: шматграннасць кантэксту

6 лютага ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося пасяджэнне калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, на якім асэнсоўваліся вынікі працы галіны за мінулы год і былі пастаўлены задачы на год бягучы.

Падрыхтаваў Яўген РАГІН / Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

Такія пасяджэнні даўно сталі традыцыйнымі, але гэтае выразна адрознівалася ад папярэдніх. Цалкам адсутнічала справаздачная пафаснасць. І ў прамове міністра культуры Юрыя Бондара, і падчас яе абмеркавання шматкроць паўтаралася: так, дасягненняў у сферы нацыянальнай культуры хапае, але фармату дзелавой сустрэчы больш пасуе актуалізацыя і аналіз наяўных у галіне праблем ды пошук канкрэтных шляхоў іх вырашэння.

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Юрый Бондар збудаваў прамову не зусім традыцыйна для выніковых калегій: у ёй — мінімум статыстыкі і справаздачнасці. "Правільна будзе абмеркаваць праблемы, — разважыў міністр, — і разам вызначыць шляхі іх вырашэння". Што зроблена, каб узняць аўтарытэт культуры на вышыню? Са слоў кіраўніка галіны, зроблена недастаткова. Гэтая пасіўнасць — прычына таго, што выдаткі на культуру ў агульным аб'ёме ВУП растуць марудна, сярэдняя заработная плата ў сферы — 485 рублёў — складае ўсяго 60 працэнтаў ад сярэдняй зарплаты ў краіне.

— Культура павінна выйсці з амплуа спрадвечнай Папялушкі, — заявіў міністр. — Сёлета трэба на справе давесці сваю жыццёвую неабходнасць грамадству.

Працяг — **на старонках 2 — 3.**

Намеснік Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Васіль Жарко ўручае Падзяку Прэм'ер-міністра краіны Ірыне Дрыга.

Гістарыёграф

ПАДАРУНАК З ЕКАЦЯРЫНБУРГА



Як ікона Веткаўскай школы апынулася на далёкім Урале.

Ст. 12

Art-блог

ІНВЕНТАРЫЗАЦЫЯ ІЛЮЗІЙ

Карэспандэнты "К" паглядзелі "Джуманджы" па-гомельску, схадзілі на новае беларускае кіно для пацалункаў, наведалі выставу Аляксандры Салдатавай і чакаюць фестываль "Рэйтан".

Ст. 8 — 9

Памяць

СПАДЧЫНА ГЕНАДЗЯ ГАРБУКА

7 лютага пайшоў з жыцця народны артыст Беларусі Генадзь Гарбук. Пераглядаючы архівы "К", узгадваем знакавыя ролі акцёра і перачытваем яго разважанні пра тэатр і кіно.

Ст. 7

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ. / З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

9 771994 478007 18006

Калегія: шматграннасць кантэксту

(Працяг. Пачатак на старонцы 1.)

Паводле Юрыя Бондара, апарат міністэрства змушаны разрывацца на тысячы спраў, адыгрываючы ролі прадзюсарскага цэнтра, цэнтралізаванай бухгалтэрыі і філіяла будтрэста адначасова, і таму ў яго, бывае, бракуе рэсурсаў на галоўнае — распрацоўку і рэалізацыю дзяржаўнай культурнай палітыкі. Некаторыя кіраўнікі занялі ўтрыманскую пазіцыю і транслююць яе падначаленым: маўляў, ва ўсім вінавата міністэрства, якое не дае грошай, а мы тут — не пры чым.

Выступоўца запэўніў: сёлета сітуацыя карэнным чынам зменіцца. Міністэрства стане ідэалагічным, прававым і кадравым штабам галіны. А ўся паўната адказнасці за творчыя ды эканамічныя вынікі і за дабрабыт работнікаў кладзецца на кіраўніцтва ўстаноў культуры. Міністр перакананы: паспяховыя топ-менеджары павінны атрымліваць высокае ўзнагароджанне за працу, найперш — за кошт зароблених арганізацыяй сродкаў. Дзеля гэтага распрацавана новае Палажэнне аб прэміяванні, якое дае магчымасць аддзячваць кіраўнікам за канкрэтныя эканамічныя вынікі нават звыш слынных 300 працэнтаў ад акладу і заахвочваць да далейшай плённай працы.

Прававое рэгуляванне. Ужо год дзейнічае Кодэкс аб культуры. Але жыццё не стаіць на месцы: паўстаюць новыя пытанні, якія патрабуюць рэгулявання. Юрый Бондар мяркуе, што праекты заканадаўчых актаў, распрацаваных Міністэрствам культуры, могуць значна паўплываць на ўмовы ажыццяўлення планаў у галіне. Будзе зроблены акцэнт на тым, каб прапаноўваць будучыя законапраекты на шырокае грамадскае абмеркаванне, каб разглядаць іх з прыцягненнем прадстаўнікоў бізнес-супольнасці, экспертаў, зацікаўленых асоб.

Асноўная задача прававога рэгулявання — узаемадзеянне з грамадствам і старанная прапрацоўка нарматыўных прававых актаў.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Аб'ём бюджэтных сродкаў на ўтрыманне і развіццё сферы склаў летась 425,2 мільёнаў рублёў, або 0,41 працэнта ВУП, што на адну сотую працэнта больш, чым у 2016 годзе. Выдаткі на культуру за кошт бюджэтнага фінансавання, з разліку на аднаго жыхара, у сярэднім па рэспубліцы склалі 1,7 базавай велічыні — пры ўстаноўленым нарматыве 1,3 базавай велічыні. Адпаведна, мінімальны сацыяльны стандарт перавыконваецца.

Сродкі, атрыманыя ад пазабюджэтнай дзейнасці ў 2017 годзе, склалі 147,6 мільёнаў рублёў, што на 10,2 працэнта больш, чым пазалетась. Тэмп росту пазабюджэтных прыбыткаў (109 працэнтаў) забяспечылі ўсе вобласці. Аднак, падкрэсліў міністр культуры, гэта не нагода для супакаення: па вялікім рахунку, пакуль сфера культуры так і не навучылася зарабляць. Работа арганізацый арыентавана пераважна на дастаткова вузкі ўнутраны рынак. Рост прыбыткаў значна спазняецца за ростам, напрыклад, аб'ёмаў уязнога турызму. А гэта ж — узаемазвязаныя галіны. Нават увядзенне бязвізавага рэжыму для грамадзян 80 краін не зрабілася падставай для пераарыентацыі дзейнасці ўстаноў культуры. Часта адсутнічаюць эфектыўныя інструменты прыцягнення гледачоў і наведнікаў — "жывыя" сайты з перакладам на замежныя мовы або акаўнты ў сацыяльных сетках.

У 2017 годзе фундатарскай дапамогі атрымана на 4 працэнта больш, чым пазалетась — 6,42 мільёна рублёў. Аднак, сцвярджае Юрый Бондар, літаральна па пальцах можна пералічыць кіраўнікоў, якія навучыліся эфектыўна працаваць са спонсарамі: гэта Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Вялікі тэатр, Нацыянальны мастацкі музей...

За мінулы год прагназуецца аб'ём экспарту паслуг у суме 4,6 мільёна долараў ЗША (рост — на 5,5 працэнтаў), сальда па знешнім гандлі паслуг — каля 3,2 мільёнаў долараў. Найбольшы аб'ём экспарту паслуг забяспечаны ўстановамі адукацыі. Да прыкладу, у Белдзяржуніверсітэце культуры і мастацтваў экспарт адукацыйных паслуг наблізіўся да 2 млн. долараў ЗША, а гэта 52 працэнты ад агульнага экспарту ўсіх устаноў адукацыі сферы культуры. У дакладзе Юрый Бондар задае пытанне: а дзе астатнія арганізацыі?

Таму асноўнымі задачамі на бягучы год у плыні эканомікі з'яўляюцца: забеспячэнне росту пазабюджэтных сродкаў арганізацый культуры не менш, чым на 6 % да леташняга ўзроўню; павелічэнне аб'ёму экспарту паслуг; забеспячэнне росту заработнай платы за кошт нарошчвання прыбыткаў ад пазабюджэтнай дзейнасці, аптымізацыі структуры і колькасці работнікаў, а таксама больш актыўнае прыцягненне спонсарскай дапамогі.

Кадры. Працэс аптымізацыі пачаўся з 2013 года. Аднак ён пакуль не паспрыяў павышэнню зарплаты. На думку міністра культуры, асноўная прычына тут — экстэнсіўны падыход. Узбуйненнем сеткі ўстаноў належнага эканамічнага эфекту не дабіцца. Варта аптымізаваць затраты на стварэнне культурных прадуктаў і аказанне паслуг. Неабходна правесці аўдыт наяўных рэсурсаў і вывучыць, наколькі рацыянальна арганізацыі культуры размешчаны па тэрыторыі краіны.

Як падкрэсліў Юрый Бондар, актуальным застаецца пытанне прыцягнення і замацавання маладых кадраў. Бо назіраецца павелічэнне ўдзельнай вагі работнікаў перадпенсійнага і пенсійнага ўзросту. Спыніўся прамоўца і на праблеме адтоку таленавітай моладзі за мяжу. Акцэнтуючы на вышэйпамянёных пытаннях, міністр вызначыў шляхі іх вырашэння. Не павінна быць фармальнага падыходу да фармавання кадравага рэзерву. Варта прыцягваць перспектыўных выпускнікоў ВНУ для ўмацавання вертыкалі кіравання. Неабходна вышукаць магчымасці для дадатковага матэрыяльнага стымулявання моладзі, для забеспячэння ёй годных жыллёва-пабытовых умоў.

Юрый Бондар.

Таксама мэтазгодна разгледзець пытанне аб павышэнні да 200 працэнтаў тарыфных ставак (акладаў) маладым спецыялістам, уключаным у банк дадзеных таленавітай моладзі, аб пазачарговым прысваенні ім кваліфікацыйнай катэгорыі, аб прынцыпі лаўрэатаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на працу ў вядучыя творчыя калектывы краіны без конкурсу.

Адукацыя. У мінулым і цяперашнім навучальным годзе ўстановы адукацыі сутыкнуліся з рэальнымі праблемамі — спад або адсутнасць конкурсу пры паступленні на асобныя спецыяльнасці, недаўкамплектаванасць кафедр у пэўных творчых ВНУ і іх філіялах прафесарска-выкладчыцкімі кадрамі з навуковымі ступенямі і званнямі.

З перакананння Юрыя Бондара, для вырашэння гэтых праблем неабходна: працягнуць аптымізацыю ўстаноў адукацыі ў сферы культуры рэспубліканскага падпарадкавання шляхам далучэння ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў якасці адасобленых структурных падраздзяленняў; мадэрнізаваць вучэбныя планы і праграмы ў адпаведнасці з патрэбамі рынку працы; нарошчваць аб'ёмы экспарту адукацыйных паслуг.

Акрэсліўшы стратэгічныя задачы, учарашні рэктар найбуйнога ВНУ галіны прапанаваў кіраўніцтву адукацыйных устаноў засяродзіць увагу і на вельмі канкрэтных захадах да паляпшэння жыцця студэнтаў. Прыкладам, у меню аб'ектаў грамадскага харчавання мусяць абавязкова быць абедзенныя комплексы даступных коштаў для любога студэнта.

Матэрыяльна-тэхнічная база. Летась, адпаведна з Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмай, асвоены сродкі на суму 17 284,5 тысяч рублёў. Капітальны рамонт праведзены на 11 аб'ектах, асвоена 2 426, 9 тысяч рублёў. За кошт рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў ды пазабюджэтных сродкаў набываліся абсталяванне і музычныя інструменты.

Галоўнай падзеяй сталася завяршэнне рэканструкцыі Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм". Заканчваюцца і работы ў галоўным корпусе Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў ды філіяле музея Вітольда Бялыніцкага-Бірулі. Ствараецца музейны квартал на базе Нацыянальнага мастацкага музея. Аднаўляецца Косаўскі палацава-паркавы ансамбль...

Разам з тым, як зазначыў міністр культуры, своечасовасці і якасці работ замінаюць недастатковае і нерытмічнае фінансаванне, незахаванне прынцыпу раўнадолевага ўдзелу сродкаў рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў, несвоечасовая выдача праектна-каштарыснай дакументацыі і праектных рашэнняў, нізкая персанальная адказнасць асобных кіраўнікоў за асваенне выдаткаваных сродкаў.

Сёлета патрэбна забяспечыць жорсткі кантроль за мэтавым выкарыстаннем сродкаў рэспубліканскага бюджэту, накіраваных на фінансаванне будаўніцтва і рамонту, за выкананнем зацверджаных графікаў і якасцю работ. Юрый Бондар параіў кіраўнікам арганізацый больш дбаць пра прыцягненне пазабюджэтных сродкаў, а не спадзявацца толькі на бюджэт.

Ахова гісторыка-культурнай спадчыны. Летась былі наладжаны работы па ўмацаванні схілу замкавай гары ў Навагрудку і рэканструкцыі Старога замка ў Гродне. На 144 аб'ектах са статусам гісторыка-культурнай каштоўнасці завершаны рамонтна-рэстаўрацыйныя работы. Як заўважыў міністр, практыка пераконвае, што варта ствараць эфектыўную і рэсурсазабеспячальную сістэму захавання згаданых аб'ектаў, якая дазволіць пастаянна павялічваць долю адрэстаўраваных помнікаў архітэктуры. Прытым, каля 300 аб'ектаў камунальнай уласнасці (9 працэнтаў ад агульнай колькасці) не выкарыстоўваюцца, альбо іх стан з'яўляецца нездавальняючым. Адсутнічаюць своечасовыя рашэнні і па захаванні такіх каштоўнасцяў. Мясцовыя ўлады павінны рабіць захады да перадачы новым уласнікам "безгаспадарчых" помнікаў архітэктуры і ствараць прывабныя ўмовы іх выкарыстання.

У дакладзе міністр вызначыў асноўныя задачы года ў сферы захавання спадчыны. Сярод іх — стымуляванне зацікаўлення фізічных і юрыдычных асоб захаваннем аб'ектаў пры перадачы іх у карыстанне (арэнду) і ва ўласнасць; павышэнне адказнасці карыстальнікаў і ўласнікаў за парушэнне заканадаўства; развіццё механізмаў прыцягнення дадатковых рэсурсаў у сферы аховы спадчыны; забеспячэнне распрацоўкі і рэалізацыі рэгіянальных мэтавых праграм захавання, інвентарызацыі, маніторынгу стану каштоўнасцяў; павышэнне ўзроўню кваліфікацыі спецыялістаў у ахове спадчыны на месцах.

Для прыцягнення ўвагі да ўнікальных архітэктурных помнікаў і нематэрыяльных элементаў нацыянальнай культуры міністр прапанаваў ідэю распрацоўкі праекта "100 шэдэўраў Беларусі".

Тэатры. У мінулым годзе стала прыкметнай сумная тэндэнцыя скарачэння колькасці паказаў спектакляў і прысутнасці гледачоў у дзяржаўных рэпертуарных тэатрах. Шэраг устаноў цягам 2017-га не выконвалі планаў па колькасці наведнікаў і атрыманні пазабюджэтных прыбыткаў. Асобныя кіраўнікі спасылаюцца на недахоп фінансаў, сезонны адток гледача, на канцэрты замежных зорак, якія пераманьваюць публіку. Але — нагадаў міністр культуры — леташнія бюджэтныя субсідыі рэспубліканскім тэатрам на новыя пастаноўкі і гастролі вырасталі, параўнальна з пазалеташнімі, на 18,6 працэнта і склалі амаль 2 мільёны рублёў. А сезонны адток гледачоў быў заўжды. Юрый Бондар перакананы: пры-

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — Ільля Васільевіч СВІРЫН; **намеснік галоўнага рэдактара** — Вераніка МОЛАКАВА; **адказны сакратар** — Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Яўген РАГІН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Генадзь СІВОХІН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ; **карэспандэнт** — Ганна ШАРКО; **фотакарэспандэнт** — Сяргей ЖДАНОВІЧ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Мая ХУТКОВА.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэклямны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
Дырэктар — СЛАБОДЗІЧ Ірына Аляксееўна;
першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна. Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
©"Культура", 2018.
Наклад 4 072. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 09.02.2018 у 19.00. Замова 470. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

чыны трэба шукаць не толькі за сценамі тэатра. Яны — у рэпертуарнай палітыцы, формах і метадах работы з наведнікам.

Аналіз заявак тэатраў на згаданыя субсідыі ў 2018 годзе паказаў: у адных выпадках тэатры прасілі сродкі на стварэнне спектакляў пры адсутнасці п'ес, у іншых — для пастановак выбіраліся "авангардныя" творы, якія ні зместам, ні формай не адпавядаюць статусу дзяржаўнага рэпертуарнага тэатра.

Як разважыў Юрый Бондар, пры фармаванні рэпертуарнай палітыкі і планаванні гастроляў неабходна ўлічваць глядацкія запатрабаванні і камерцыйную акупнасць спектакляў і гастроляў. За прыклад тут можна ўзяць дзейнасць Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, эканамічны эфект (прыбытковасць) ад пастановак якога склаў 139 працэнтаў — пры забеспячэнні разнастайнасці рэпертуару, адпаведнага статусу тэатра.

Ёсць і адваротныя прыклады. З меркавання міністра культуры, Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага цягам мінулага года хранічна не забяспечваў выканання даведзеных планавых паказчыкаў па колькасці гледачоў і атрыманні пазабюджэтных прыбыткаў. Прыбытковасць жа новых пастановак Вялікага тэатра за мінулы год склала каля 20 працэнтаў — у сувязі з большымі, чым у іншых тэатрах, выдаткамі на стварэнне спектакляў.

Для ўдасканалення тэатральнай дзейнасці ў гэтым годзе Юрый Бондар прапанаваў наступнае: увесці вочную абарону ў Міністэрстве культуры планаў новых пастановак за кошт бюджэтных субсідый; падтрымаць ініцыятывы тэатраў аб правядзенні конкурсаў твораў сучаснай беларускай драматургіі з прыярытэтным фінансаваннем пастановак п'ес-пераможцаў; падоўжыць практыку правядзення конкурсаў эксплікацый для маладых рэжысёраў з наступнай пастаноўкай спектакляў-пераможцаў на сцэнах рэпертуарных тэатраў.

Канцэртная дзейнасць. Як па краіне увогуле, так і ў арганізацыях рэспубліканскага падпарадкавання назіраецца скарачэнне паказчыкаў работы канцэртных арганізацый. Стабільныя вынікі дзейнасці дэманстравалі Нацыянальны акадэмічны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны ансамбль "Песняры", Дзяржаўны акадэмічны ансамбль танца Беларусі і некаторыя іншыя арганізацыі.

Між тым, Беларуская дзяржаўная філармонія і Нацыянальны акадэмічны народны хор імя Генадзя Цітовіча летась адчувалі складанасці з выкананнем планаў. Агулам план гастрольна-канцэртнай дзейнасці тэатральна-відовішчных (канцэртных) арганізацый, які рэгламентуе выступленні рэспубліканскіх творчых калектываў у рэгіёнах, не выкананы амаль на чвэрць.

Як выснаваў Юрый Бондар, канцэртныя праблемы маюць у многім аднолькавую прыроду з праблемамі тэатральнымі: адсутнічае прадуманая і пралічаная стратэгія планавання новых праграм і гастроляў; назіраецца нежаданне кіраўнікоў асобных калектываў рыхтаваць праграмы, разлічаныя на запатрабаваныя заказчыкам малыя склады; недастаткова актыўна шукаюцца спонсарскія сродкі.

Міністр культуры абвясціў задачы на год: укараніць практыку абароны ў Міністэрстве культуры планаў новых канцэртных праграм за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту з абгрунтаваннем папярэдняга разліку выдаткаў на іх стварэнне, плану акупнасці і геаграфіі паказу; забяспечыць рэалізацыю плана гастрольна-канцэртнай дзейнасці ў поўным аб'ёме; скасаваць практыку садзеяння асобным артыстам у правядзенні канцэртаў "па пісьмах", што стварае сітуацыі несумленнай канкурэнцыі з іншымі калектывамі і выканаўцамі.

Выяўленчае, манументальнае мастацтва і дызайн. Летась была ўпарадкавана арганізацыя закупак твораў выяўленчага мастацтва: сталіся абавязковымі да выканання метадычныя рэкамендацыі па вызначэнні кошту, а таксама папярэдняя экспертыза твораў, прапанаваных да закупкі прэзідыумам Беларускага саюза мастакоў. Спынены спробы асобных мастакоў ці іх спадчыннікаў лабіраваць штогадовыя закупкі ўласных работ або твораў родзічаў.

Міністэрства культуры мае намер і надалей прытрымлівацца адкрытых і празрыстых правілаў гульні. Прыярытэт будзе надавацца ўзорам высокага мастацтва. Чарговая задача — распрацоўка адзінай стратэгіі стварэння і ўстаноўкі твораў манументальнага мастацтва, своеасаблівага плана манументальнай прапаганды.

Кінематаграфія. У мінулым годзе амаль удвая павялічыліся аб'ёмы вытворчасці фільмаў, створаных з дзяржаўнай падтрымкай дзяржаўнымі і прыватнымі кінакампаніямі. Летась іх зроблена 36. Тры з іх — за кошт пазабюджэтных сродкаў. Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" спрацавала без страт. Павялічыліся фактычныя аб'ёмы паступлення грошай ад камерцыйнага выкарыстання фільмаў. У вытворчасці знаходзіцца каля 30 ігравых, дакументальных і анімацыйных стужак.

Тым самым часам, як азначыў міністр культуры, многія праблемы ў гэтай сферы яшчэ чакаюць свайго вырашэння. Прыкладам, непрыняццё выклікае нездаровы інфармацыйны фон вакол беларускага кіно. Са слоў Юрыя Бондара, моду ў айчынным кінематографе дыктуюць не прадзюсары і кінакрытыкі, а заўсёднікі сацыяльных сетак. Таму стала папулярным дзіўнае ўяўленне пра "сучаснае" беларускае кіно: "чарнуха", знятая за тры капейкі на лічбавую камеру. Немалая доля адказнасці за сітуацыю ляжыць і на самой кінастудыі. Яна не забяспечыла добрай якасці прадукцыі, не распрацавала дакладнай стратэгіі творчага развіцця, у тым ліку і па рэалізацыі нашай фільмапрадукцыі на знешнім рынку.

У дакладзе міністр культуры акрэсліў і некаторыя "вузкапрофільныя" праблемы айчыннага кінематографа. Не робяцца захады дзеля пераходу нашага анімацыйнага кіно на сучасныя тэхналогіі. На студыі "Летапіс" слаба распрацоўваюцца вострыя сацыяльныя тэмы, мала ствараецца гістарычных стужак.

Заканчэнне — **на старонцы 4.**

Пра кінематограф, маладыя таленты і Еўрагульні

Сваім бачаннем актуальных пытанняў у сферы культуры краіны падзяліўся намеснік Прэм'ер-міністра краіны Васіль ЖАРКО.

Напачатку прадстаўнік беларускага Урада падзякаваў усім прысутным за іх крэатыўную і самаадданую працу, скіраваную на ўздым нацыянальнай культуры, зазначыўшы пры гэтым, што яна павінна адпавядаць сённяшняму дню, ісці ў нагу з часам і імкнуцца да новых дасягненняў на карысць усіх беларусаў. А дзяржава, у сваю чаргу, заўсёды гатовая падтрымаць цікавыя і адметныя праекты і пачынанні работнікаў сферы культуры.

Яскравым сведчаннем падобнай падтрымкі, па словах Васіля Жарко, з'яўляюцца прэміі "За духоўнае адраджэнне" і спецыяльныя прэміі дзеячам культуры і мастацтва, якія ўручаюцца напачатку кожнага года.

Васіль Іванавіч таксама адзначыў, што, нягледзячы на рэальныя поспехі на ніве культуры Беларусі, у гэтай галіне пакуль не вырашаны шэраг праблемных пытанняў. Адно з іх звязана з далейшым развіццём Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм".

Як падкрэсліў віцэ-прэм'ер, па завяршэнні рэканструкцыі кінастудыі там створаны ўсе неабходныя ўмовы для работы, таму гледачы нецярпліва чакаюць з'яўлення на экранах новых цікавых стужак, зробленых беларускімі кінематаграфістамі. На думку Васіля Жарко, кінастудыі неабходна больш актыўна прасоўваць сваю прадукцыю на знешнія рынкі. А для гэтага трэба вучыцца шукаць партнёраў па сумесных праектах — у тым ліку і ў недзяржаўным сектары, паглыбляць супрацоўніцтва з тэлеканаламі.

Як адзначыў віцэ-прэм'ер, неабходна звярнуць увагу і на пытанні развіцця культуры ў рэгіёнах. У раённых цэнтрах цяпер не так ужо і часта можна ўбачыць выступленні вядомых сталічных артыстаў, выставы нацыянальных музеяў, спектаклі вядучых тэатраў. За апошнія гады колькасць канцэртаў, арганізаваных філармоніямі ў раёнах Беларусі, зменшылася ў два разы.

Між тым, як падкрэсліў Васіль Жарко, для арганізацыі гастрольнай работы створаны ўсе ўмовы, ёсць стабільнае фінансаванне, прадугледжаны сродкі на стварэнне новых спектакляў і праграм. Віцэ-прэм'ер даручыў выканкамам распрацаваць план мерапрыемстваў па арганізацыі гастрольнай дзейнасці ўстаноў культуры рэспублікі ў рэгіёнах.

Адзначыўшы, што ў Беларусі здолелі захаваць сістэму мастацкай і музычнай адукацыі на ўсіх узроўнях, Васіль Жарко паставіў пытанне не аб колькасці, а аб якасці выпускнікоў. Віцэ-прэм'ер даручыў Міністэрству культуры краіны прааналізаваць пытанні падрыхтоўкі кадраў у галіне з разлікам на перспектыву, а таксама разгледзець магчымасць аптымізацыі тэрмінаў навучання па некаторых спецыяльнасцях.

Акрамя таго, паводле меркавання Васіля Жарко, Міністэрству культуры сёння патрэбна актывізаваць работу з таленавітай моладдзю. У краіне створаны банк даных тых прадстаўнікоў новага пакалення, якія з'яўляюцца кадравым патэнцыялам галіны. Прадстаўленыя там асобы даволі часта застаюцца незапатрабаванымі, а зрэдку становяцца вядомымі ў суседніх краінах. Такога, як падкрэсліў віцэ-прэм'ер, быць не павінна.

Васіль Жарко закрануў таксама пытанне замацавання кадраў на месцах. Напрыклад, вядома, што каля 30 працэнтаў маладых спецыялістаў у сферы культуры не застаюцца працаваць пасля заканчэння тэрміну размеркавання. Летась на мэтавую падрыхтоўку ў сярэднія навучальныя ўстановы прыняты толькі 122 чалавекі, а гэта ўсяго 9 працэнтаў ад агульнай колькасці тых, хто паступіў у каледжы сферы культуры. На думку Васіля Жарко, над дадзенай праблемай неабходна працаваць усім зацікаўленым і адказным асобам.

У дакладзе віцэ-прэм'ер закрануў і тэму арганізацыі ў Беларусі міжнароднага дзіцячага конкурсу песні "Еўрабачанне-2018" і II Еўрапейскіх гульняў у 2019 годзе. Ён выказаў упэўненасць у тым, што конкурс пройдзе на самым высокім узроўні, і даручыў ужо цяпер пачынаць работу па пошуку і падрыхтоўцы прадстаўніка ад Беларусі, здатнага прынесці нам новую перамогу. А да II Еўрагульняў, на думку Васіля Жарко, неабходна дасканала прадумаць план арганізацыі вольнага часу гасцей. Важна і ў тэатрах, і ў музеях прапаноўваць турыстам менавіта тыя мерапрыемствы, якія могуць быць ім цікавыя.

Усе гэтыя і іншыя пытанні, сярод якіх і абнаўленне сайта Міністэрства культуры Беларусі згодна з сучаснымі стандартамі, па словах Васіля Жарко, трэба вырашаць у найбліжэйшы час. Прычым вырашаць не спехам, а разважліва, з думкай на перспектыву і з улікам усіх наяўных дасягненняў работнікаў галіны.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Калегія: шматграннасць кантэксту

(Заканчэнне. Пачатак на старонках 1 — 3.)

А самае галоўнае — няма нацыянальнага праекта, які стаў бы візітоўкай “Беларусьфільму” і ўсяго айчыннага кіно. Міністр культуры выказаў меркаванне, што неабходна паскорыць стварэнне праекта Указа аб стымуляванні развіцця кінематографа. Варта радыкальна змяніць падыходы да фармавання праграм Мінскага міжнароднага кінафестывалю “Лістапад”, і ў першую чаргу — нацыянальнага конкурса, арганізатары якога ў немалой ступені паспрыялі “змяшчэнню” акцэнтаў ва ўяўленнях пра беларускае кіно. Юрый Бондар паставіў задачу перагледзець падыходы да фармавання праграмы “Лістапада”, згодна з ягонай місіяй гуманізму і духоўнасці.

Клубы і метадычныя цэнтры. З парушэннем дзяржаўнага сацыяльнага стандарту, установы культуры дасюль адсутнічаюць у 89 аграгарадках. Назіраецца змена інтарэсаў насельніцтва ў сферы баўлення вольнага часу. Усё больш людзей аддаюць перавагу наведанню сацыяльных сетак, а не клубных мерапрыемстваў. Вось адна з прычын леташняга скарачэння на 8 працэнтаў колькасці клубных фармаванняў. А ўсё ж, — упэўнены міністр культуры, — гэтая прычына, як і аптымізацыя, не з’яўляецца апраўданнем абыякавасці клубных кіраўнікоў да падтрымкі народнай творчасці і аматарскага мастацтва.

Як спрагназаваў Юрый Бондар, сёлета большую выніковасць мусіць выявіць у працы аддзел метадычнага забеспячэння клубных арганізацый і непрафесійнай творчасці, заснаваны пры Рэспубліканскім цэнтры нацыянальных культур. Бо задача аддзела — не толькі збор інфармацыі і правядзенне семінараў, але і распрацоўка стратэгіі развіцця клубнай работы, каардынацыя яе выканання.

Актуальнай застаецца і патрэба ўпарадкавання фестывальнай сістэмы для больш рацыянальнага выкарыстання сродкаў. На думку міністра культуры, далёка не ўсе сённяшнія фестывалі адпавядаюць статусам “міжнародны”, “рэспубліканскі”, “абласны”.

Музеі. Лідарамі наведвальнасці летась сталі Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Мемарыяльны комплекс “Брэсцкая крэпасць-герой”, Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік “Нясвіж”, Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь і Замкавы комплекс “Мір”. Але высокай застаецца ўдзельная вага “бясплатнікаў”.

Як вызначыў у сваім дакладзе міністр культуры, на фоне актыўнай работы па стварэнні музейных экспазіцый у рэгіёнах гэтая задача правалена ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры, які атрымаў 251,3 тысячы рублёў з бюджэтных сродкаў. Неадназначна можна ацаніць работу Нацыянальнага гістарычнага музея. Так, ён уваходзіць у пяцёрку найбольш наведвальных устаноў, з’яўляецца адным з лідараў у справе прыцягнення спонсарскіх сродкаў. Аднак асноўныя паказчыкі згаданай установы не выкананы, сярэдняя заработная плата супрацоўнікаў застаецца адной з самых нізкіх сярод рэспубліканскіх музеяў (441,7 беларускіх рублёў).

Надзённымі задачамі застаюцца таксама стварэнне пастаянных экспазіцый філіяла Музея Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, Паўднёва-Усходняй казармы Брэсцкай крэпасці, праектаванне новага будынку Нацыянальнага гістарычнага музея.

Бібліятэкі. Летась адзначана стабілізацыя колькасці публічных бібліятэк. Павялічылася і агульная колькасць іх наведванняў. Але міністр культуры звярнуў увагу мясцовых уладаў на тое, што сёння цалкам камп’ютарызаваны толькі бібліятэкі сталіцы і Гродзенскай вобласці. Дзве траціны бібліятэчнага камп’ютарнага абсталявання патрабуе мадэрнізацыі. У палове ўстаноў не абнаўлялася спецыялізаванае праграмнае забеспячэнне. Пакідае жадаць лепшага і абнаўляльнасць кніжных фондаў. Самы нізкі паказчык (2,4 працэнта) — у Магілёўскай вобласці.

Міжнароднае супрацоўніцтва. У мінулым годзе падпісана 11 міжнародных дамоў у сферы культуры. Былі арганізаваны Дні беларускай культуры ў шасці краінах. Адбылося 118 службовых камандзіровак за мяжу.

Нягледзячы на такія суцешныя паказчыкі, міністр культуры выказаў упэўненасць у тым, што наспела патрэба ў новых формах ды ідэях прэзентацыі беларускай культуры ў свеце. Таму сёлета трэба істотна перагледзець падыход да планавання і правядзення замежных камандзіровак кіраўнікоў арганізацый культуры, мэтай якіх павінна быць заключэнне дамоў, кантрактаў з доўгатэрміновым эфектам; стварыць “жывыя” сайты арганізацый культуры з перакладам тэкстаў на некалькі замежных моў; пашырыць прысутнасць у сацыяльных сетках; больш актыўна ўдзельнічаць у міжнародных праектах.

Гарады і асобы, што сталі найлепшымі

На пасяджэнні выніковай калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь прайшлі цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў трох рэспубліканскіх конкурсаў па выніках 2017 года.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ / Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

Людзі Года культуры.

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Юрый Бондар уручыў дыпломы пераможцам рэспубліканскага конкурсу “Чалавек Года культуры”. У намінацыі “Музейная дзейнасць” журы адзначыла дырэктара Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Алену Ляшковіч. Метадыст Ашмянскага раённага цэнтра культуры Сяргей Жылік быў уганараваны ў намінацыі “Захаванне гісторыка-культурнай спадчыны”.

У намінацыі “Бібліятэчная дзейнасць” перамог намеснік дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша, у намінацыі “Клубная дзейнасць” — дырэктар Палаца культуры Мінскага трактарнага завода Уладзімір Кірута, а ў намінацыі “Архітэктура і рэстаўрацыя” — загадчык філіяла “Брэстрэстаўрацыяпраект” ААТ “Белрэстаўрацыя” Аляксандр Качаноўскі.

У намінацыі “Выяўленчае мастацтва” найлепшым прызнаны дацэнт кафедры графічнага дызайну Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Усевалад Свентахоўскі. Загадчык кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва ўстановы Уладзімір Зінкевіч стаў пераможцам у намінацыі “Манументальнае мастацтва”.

Дыпломам і грашовай прэміяй адзначана таксама прыма Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Аксана Волкава ў намінацыі “Тэатральнае мастацтва”, а ў “Музычным мастацтве” — дырэктар і мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага аркестра эстраднай і сімфанічнай музыкі народны артыст Беларусі Міхаіл Фінберг.

Прафесару кафедры опернай падрыхтоўкі і харэаграфіі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Валянціну Елізар’еву прысуджана ўзнагарода ў намінацыі “Харэаграфічнае мастацтва”. Пераможцам намінацыі “Эстраднае мастацтва” журы назвала галоўнага рэжысёра аддзела канцэртна-фестывальнай работы Магілёўскай абласной філармоніі Тамару Залешчанка.

У намінацыі “Цыркавое мастацтва” ўганараваны рэжысёр студыі цыркавога мастацтва “Арэна” (Мазыр) Барыс Кузняцоў. Кінарэжысёру студыі “Летапіс” Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм” Ігару Чышчэню прысуджана ўзнагарода ў намінацыі “Кінавідэамастацтва”.

Пераможца ў намінацыі “Народная творчасць” — дырэктар Лепельскай дзіцячай школы мастацтваў, кіраўнік фальклорнага калектыву “Сунічкі” Стайскай дзіцячай школы мастацтваў традыцыйнай культуры Вераніка Хомбак. Віншаванні таксама прымалі народны майстар, кіраўнік гуртка ткацтва “Ніток” Неглюбскага сельскага цэнтра ткацтва Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці Людміла Кавалёва ў намінацыі “Народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва”, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Вольга Дадзіёмава ў намінацыі “Педагагічная дзейнасць з творчай моладдзю”, спецыяльны карэспандэнт Другога нацыянальнага тэлеканала Аляксандр Мацяс ў намінацыі “Асвятленне пытанняў культуры ў сродках масавай інфармацыі”.

Конкурс праводзіўся з мэтай стымулявання творчай і дзелавой ініцыятывы работнікаў культуры, прапаганды інавацыйных ідэй і перадавога вопыту ў культурнай дзейнасці. Яго арганізатарамі выступілі Міністэрства культуры і Міністэрства інфармацыі, абласныя выканаўчыя камітэты, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт, Беларуская канфедэрацыя творчых союзаў.

Таксама на пасяджэнні калегіі адбылося ўзнагароджанне пераможцаў рэспубліканскага конкурсу “Горад культуры” па выніках 2017 года. Дыпломы ўручыў старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы Ігар Марзалюк.

У намінацыі “Найлепшы абласны цэнтр” пераможцам стаў Гродна. “Найлепшым горадам абласнога падпарадкавання” названы Бабруйск. Светлагорск перамог у намінацыі “Найлепшы горад раённага падпарадкавання”. “Найлепшым пасёлкам гарадскога тыпу” стаў Сапоцкін у Гродзенскім раёне, а “Найлепшым аграгарадком” — Адэльск з таго ж рэгіёну.

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Кацярына Дулава ўручыла дыпломы пераможцам рэспубліканскага конкурсу на найлепшую практыку дзейнасці органаў мясцовай улады па рэалізацыі дзяржаўнай культурнай палітыкі па выніках 2017 года. У “абласной” намінацыі перамога прысуджаная Брэсцкаму аблвыканкаму. “Найлепшым гарадскім (раённым) выканкамам па рэалізацыі дзяржаўнай культурнай палітыкі” стаў Клецкі, а на сяле ўсіх абыйшоў Залескі сельвыканкам са Смаргоншчыны.

Таксама падчас выніковай калегіі Міністэрства культуры выбітным супрацоўнікам галіны ўручаны нагрудныя знакі “За ўклад у развіццё культуры Беларусі”. Першы намеснік міністра культуры Ірына Дрыга атрымала Падзяку Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь.

К

Суплёт наспелых пытанняў

Культура ў люстэрку эканамічных патрабаванняў

На справаздачнай калегіі Міністэрства культуры традыцыйна выступаюць з дакладамі прадстаўнікі розных кірункаў сферы. У асяродку калег з усіх рэгіёнаў краіны, сабраных у зале пасяджэнняў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, выступоўцы ставілі на мэце прааналізаваць дасягненні апошняга часу, узняць наспелыя праблемы і акрэсліць пастаўленыя перад галіной задачы на 2018 год.

Настасся ПАНКРАТАВА / Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

ДОСВЕД ці АТРАКЦЫЁН?

Сяргей Клімаў.

Першым да мікрафона выйшаў **Сяргей Клімаў**. Дырэктар нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Нясвіж" распавёў пра тэндэнцыю з'яўлення ў краіне новых музеяў. З яго слоў, гэта не айчынны феномен: у сярэднім у свеце штогод узнікае 700 новых экспазіцыйных кропак, і звязана тое са сферай турызму, якая надзвычай дынамічна развіваецца. Выступоўца адзначыў: "Калегі ў Еўропе і на іншых кантынентах даводзяць, што сённяшнія наведнікі шукаюць не веды (па інфармацыю публіка ўсё часцей звяртаецца ў Сеціва), а эмоцыі. Можна палемізаваць, чым сёння з'яўляецца музей — храмам ці атракцыёнам, аднак цяжка спрачацца з агульнасусветным трэндам".

Людзей прыцягвае эксклюзіўнасць аб'екта, зручная інфраструктура, урэшце, — магчымасць смачна паабедаць. Беларусь ўсё гэта можа прапанаваць турысту. Бязвізавы рэжым зрабіў нацыянальныя славутасці "бліжэйшымі" да замежнікаў: той самы музей-запаведнік "Нясвіж" за апошні год наведала на 35 працэнтаў больш іншамоўных турыстаў. Але ці адказваюць айчынныя музейшчыкі на выклік часу?

— Сёння да работы з буйнымі турыстычнымі плынямі адаптаваны не больш за пяць музейных пляцовак краіны, — канстатаваў выступоўца. — Яны маюць адпаведную інфраструктуру, у якую былі ўкладзены значныя інвестыцыі. Астатнія ўстановы знаходзяцца ў складаных — у першую чаргу, эканамічных — умовах: ім бракуе сродкаў на новыя праграмы, у іх старыя экспазіцыі, і таму яны не цікавыя масаваму турысту, які якраз і прыносіць грошы ва ўстанову.

Спадар Клімаў разважаў над пытаннем, ці варта выконваць патрабаваныя паказчыкі платных паслуг адно праз камерцыйныя, часам кітчавыя выставы і прымусовыя культпаходы школьнікаў. Па яго меркаванні, ёсць некалькі варыянтаў выйсця з сітуацыі. Пачаць можна з унутранай рэвізіі і арганізацыйнага праектавання. Агульнавядома, што поспех любой арганізацыі вызначаюць кадры. Дырэктар упэўнены: вывесці музей з крызісу можа толькі дасведчаны кіраўнік, таму трэба набіраць спецыялістаў па конкурсе. У Беларусі ўжо былі два такія прэцэдэнты, і гэта дало станоўчы вынік.

На думку Клімава, у некаторых айчынных установах неапраўдана вялікі штат. Для ўнутранага рэфармавання ён прапануе новы арганізацыйны канфігуратар. У суседніх краінах усё часцей ствараюцца музейныя холдынгі, кластары, аб'яднаныя музеі, і такая форма дазваляе канцэнтраваць кадры, фінансы, тэхналогіі для адэкватнага адказу на выклікі часу, рацыянальна перараз мяркоўваць сродкі, развіваць інфраструктуру.

— Хуткасць руху да кардынальных змен вызначаецца нарматыўнай базай. На жаль, у музейнай сферы яна застарэла. Нават Кодэкс аб культуры, у многіх аспектах, не адпавядае запатрабаванням сённяшняга часу, — падкрэсліў дакладчык. — Няма распрацаваных палажэнняў адносна функцыянавання музеяў у сучасных эканамічных варунках, дзяржаўна-прыватнага партнёрства, працы на фінансавых рынках, а таксама капіталізацыі прадметаў гісторыі і культуры. У Беларусі назіраецца вострая неабходнасць сталай працы з нарматыўнымі базамі — найперш уключэння ў іх новых пастулатаў. Рашэннем гэтай задачы магло б стаць стварэнне пры адным з вядучых музеяў краіны цэнтра музейнай дакументацыі і экспертызы, здатнага аказваць метадычную дапамогу і кансультацыі ў складанні экспазіцый, выставак, атрыбуцый.

Прагучала на пасяджэнні і выказванне пра адсутнасць у краіне цэнтра, які рабіў бы поўную экспертызу музейных прадметаў. Са слоў Сяргея Клімава, гэтая акалічнасць часам вельмі моцна ўплывае на кошт набыцця прадмета ў экспазіцыю: "Вядомыя выпадкі, калі за ідэнтычныя рэчы нашы музеі выдаткоўвалі сумы, адрозныя адна ад адной у два-тры разы".

Як заўважыў дакладчык, у нас немагчыма вызначыць сапраўдны кошт многіх прадметаў, бо няма свабоднага рынкавага продажу. За мяжой гэтыя задачы вырашаюць аўкцыённыя дамы — гэта на сённяшні момант адзіная празрыстая форма пакупкі. На думку Сяргея Клімава, настаў час для стварэння іх у Беларусі.

БОЛЕВЫЯ КРОПКІ НА ТЭАТРАЛЬНАЙ ВОСІ

Праблемы развіцця тэатральнага мастацтва краіны раскрыў **Уладзімір Карачэўскі**. Дырэктар Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі казаў пра складанасці з нацыянальным рэпертуарам. Ён акцэнтаваў: з'явілася плеяда айчынных драматургаў, чые п'есы ставяць, чытаюць, перакладаюць не толькі на постсавецкай тэрыторыі, а часам нават у такіх экзатычных

Уладзімір Карачэускі.

краінах, як Уругвай. Аднак у нас са спектаклямі па п'есах маладых драматургаў справы куды складаней: у многіх тэатрах сучасная беларуская драматургія практычна не прысутнічае.

— Часта нежаданне дзяржаўных рэпертуарных тэатраў узяць у афішу такі матэрыял абгрунтавана высокімі камерцыйнымі рызыкамі, — патлумачыў прамоўца.

З маладымі драматургамі актыўна працуе Цэнтр сучаснай драматургіі пры РТБД і Цэнтр эксперыментальнай рэжысуры пры Акадэміі мастацтваў. Эвалюцыянуе фармат Рэспубліканскага фестывалю нацыянальнай драматургіі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў Бабруйску. Спадар Карачэўскі лічыць, што паступова гэты форум павінен стаць адной з галоўных тэатральных падзей Беларусі.

— Наспеў час ладзіць конкурсы для драматургаў на стварэнне п'ес пэўнай тэматыкі з добрым прэміяльным фондам, — упэўнены Уладзімір Міхайлавіч, і ў якасці пазітыўнага вопыту прывёў нашумелае творчае спаборніцтва "Францыск Скарына і сучаснасць", вынікам якога сталі добры зборнік п'ес і тры новыя спектаклі ў рэспубліканскім рэпертуары. Таму РТБД у бягучым годзе плануе правесці разам з АСБ "Беларусбанк" новы конкурс — гэтым разам на стварэнне арыгінальнай п'есы камедыйнага жанру для драматычных тэатраў.

Дакладчык дадаў: сёння тэатрам у рэгіёнах не хапае фінансавання не толькі на новыя пастаноўкі і гастролі, але часам нават і на ўласнае ўтрыманне. З меркавання спадара Карачэўскага, мясцовыя ўлады маглі б аказваць падначаленым ім тэатрам большую дапамогу. Адна з самых болевых кропак — праблемы рэжысёрскіх і акцёрскіх кадраў. З прычыны нізкіх заробкаў і адсутнасці жылля стала немагчыма затрымаць маладых спецыялістаў у рэгіёнах.

Прыгадаў Уладзімір Міхайлавіч і цяжкасці з падборам і павышэннем кваліфікацыі спецыялістаў тэхнічных службаў — рэжысёраў па святле, гукарэжысёраў, загадчыкаў пастановачнай часткі.

— Не заўсёды выкананне планаў па колькасці спектакляў, гледачоў, пастановак з'яўляецца эфектыўным паказчыкам работы, — заявіў спадар Карачэўскі. І патлумачыў сваю выснову: эфектыўнасць вымяраецца якасцю спектакляў, значнасцю праектаў, іміджам калектыву, узнагародамі; найлепшае дасягненне тэатра — запатрабаванасць у публікі, пазнавальнасць яго актораў, інтарэс СМІ да яго дзейнасці, зацікаўленасць у супрацоўніцтве партнёраў і мецэнатаў, удзел у міжнародных фестывалях і стварэнне сумесных праектаў.

ПРЫЯРЫТЭТ — ЭТНАКІРУНКУ

Сёлета спецыяльную прэмію Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва атрымаў калектыў Акцябрскага раённага Дома рамёстваў за значны ўклад у захаванне і папулярызацыю традыцыйных ткацкіх рамёстваў і актыўную выставачную дзейнасць. На калегіі Міністэрства культуры начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама **Святлана Беразоўская** падкрэсліла: менавіта дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы, у краіне захоўваецца традыцыйная культура. Нездарма прыярытэтным кірункам дзейнасці ўстаноў культуры раёна застаецца адраджэнне, захаванне і папулярызацыя народнай спадчыны.

Амаль трыццаць гадоў таму была вызначана асноўная стратэгія развіцця сферы культуры ў раёне, якая ўключае адраджэнне свят народнага календара і рамёстваў, што пабытавалі на дадзенай тэрыторыі, падтрымку і развіццё аўтэнтычных калектываў, стварэнне дзіцячых і маладзёжных фальклорных ансамбляў і груп. Ужо ў 1992 годзе з'явіліся 7 устаноў новага тыпу — Дамоў народнай творчасці. Цяпер у раёне функцыянуе 247 клубных фармаванняў, 74 з якіх — фальклорнага кірунку, у тым ліку 48 — дзіцячых, бо асаблівая ўвага надаецца менавіта заахвочванню маладога пакалення да вывучэння і пераймання народных традыцый.

Святлана Беразоўская.

Свой вопыт культработнікі дэманструюць на абласных і рэспубліканскіх мерапрыемствах. Так, у лістападзе пры судзеянні Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Акцябршчыну наведалі ўдзельнікі творчай стажыроўкі беларусаў замежжа. Прадстаўнікі дзевяці краін навучаліся нацыянальным рамёствам, песням і танцам.

— Сапраўдным брэндам і гонарам раёна стаў Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва "Берагіня", — канстатавала спадарыня Беразоўская. — Кожны форум збірае больш за тысячу ўдзельнікаў. Традыцыйна ў фестывальныя дні адбываецца да трыццаці мерапрыемстваў, у тым ліку семінары, майстар-класы, навукова-практычныя канферэнцыі, па выніках якіх выдадзены шэраг публікацый, даведнікаў, абаронены дыпломныя працы па этнаграфіі і фальклоры. Дзякуючы "Берагіні", у рэспубліцы створана мадэль этнакультурнага выхавання дзяцей і моладзі, распачаты фальклорны рух, і моладзь, далучаная да яго, папулярызуе ўзоры традыцыйнай культуры сваіх рэгіёнаў. Толькі ў Акцябрскім раёне за гады правядзення фестывалю паўстала больш за 20 такіх калектываў.

СТРАТЭГІІ ПАСЛЯ РЭКАНСТРУКЦЫІ

Ігар Поршнеў.

Як зазначыў на пачатку свайго выступу генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" **Ігар Поршнеў**, падпарадкаваная яму ўстанова на сёння з'яўляецца папраўдзе першакласным еўрапейскім прадпрыемствам, на якім можна ствараць кіно. За мінулы год кінастудыяй у рамках сацыяльнага заказа было створана 5 фільмаў ігравога фармату (адзін — камерцыйны), 15 фільмаў неігравога фармату, 9 — анімацыйных. За гэты ж перыяд былі аказаны паслугі вытворча-тэхнічнай базы 119 заказчыкам, з якіх толькі пяць — нерэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

Заканчэнне — **на старонцы 6.**

Суплёт наспелых пытанняў

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 5.)

Да снежня 2018 года прададзены выключныя правы на асноўны пакет самых запатрабаваных фільмаў кінастудыі. А гэта 174 найменні. На пэўныя назвы дамова падпісана да 2019 года. У выніку, за студзень-снежань 2017 года было рэалізавана маёмасных правоў на суму 270 тысяч рублёў з рэзідэнтамі краіны, 788 тысяч рублёў — з нерэзідэнтамі, што значна перавышае лічбы даведзенага плану. Як падкрэсліў спадар Поршнеў, летась тэрыторыя продажу правоў на прадукцыю кінастудыі значна пашырылася: да заказчыкаў з краін экс-СССР дадаліся партнёры з Германіі, Францыі, Эстоніі, Бельгіі, Люксембургу. За мінулы год стужкі "Беларусьфільму" пабывалі на больш як паўсотні міжнародных фестывалях, некаторыя вярнуліся дадому з прызамі.

У мэтах забеспячэння інтарэсаў студыі "Беларусьфільмам" праводзіцца праца ў кірунку самастойнай рэалізацыі маёмасных правоў на прадукцыю ўласнай вытворчасці. Установа наўпрост вядзе перамовы ў справе пракату карцін на айчынных і замежных тэлеканалах — у прыватнасці, робяцца захады дзеля ўмацавання сваіх пазіцый на рынку Кітайскай народнай рэспублікі, актывізаваны перамовы па дыстрыб'юцыі прадукцыі ў Францыі, Польшчы, Канадзе. Пашырана і прысутнасць кантэнту кінастудыі на папулярных лічбавых платформах у інтэрнэце. Запланаваны ўдзел у міжнародных кінарынках, што будуць праводзіцца сёлета.

— А таксама на кінастудыі вядзецца актыўная праца па арганізацыі экскурсійнай дзейнасці, — распавёў выступоўца. — Падчас пробных экскурсій у кастрычніку-снежні мінулага года кінастудыю ўжо наведала некалькі соцень чалавек. Заяўкі працягваюць паступаць, таму для іх апрацоўкі будзе ствараца самастойны экскурсійны аддзел.

З улікам завяршэння рэканструкцыі кінастудыя разлічвае забяспечыць вытворчасць у год не менш як 6-ці фільмаў ігравой формы (адзін нацыянальны, адзін дзіцячы, адзін дэбютны і тры камерцыйнага плану), а таксама 25 стужак неігравых і 8 анімацыйных. Для павышэння акупнасці стратэгія вытворчасці будзе збудавана гэтак, каб фільм з буйным бюджэтам выходзіў раз на два гады, астатнім жа часам пашырыцца вытворчасць карцін з бюджэтам 500 тысяч долараў, сярод якіх маюць здымацца камедыі і фільмы для сямейнага прагляду.

— Гэта забяспечыць сталую прысутнасць айчынных стужак у пракаце і, у сваю чаргу, павысіць працэнт абарачэння ўкладзеных у іх сродкаў, — выказаў упэўненасць гендырэктар.

У якасці станоўчага прыкладу ён падаў фільм Вячаслава Нікіфарава "Тум-Пабі-Дум", што выйшаў на пачатку месяца ў шырокі пракат, і, паводле слоў спадара Поршнева, паспяхова збірае гледачоў ды ўжо мае неблагія касавыя паказчыкі.

Як перспектыўную форму працы кінастудыя разглядае пашырэнне камерцыйнага распаўсюджання фільмаў праз інтэрнэт.

Кацярына Дулава.

Адміністрацыю ўстановы натхняе прыклад карціны "Сляды на вадзе", якая за чатыры месяцы прысутнасці ў Сеціве сабрала 5 мільёнаў праглядаў. Распрацавана комплексная сістэма падыходаў не толькі да вытворчасці новага годнага прадукту, але і да пытанняў яго суправаджэння, выраду на ўнутраны і міжнародны рынак, дзеля чаго вырашана выкарыстоўваць сучасныя механізмы рэбрэндынгу.

БЕСПЕРАПЫННАСЦЬ АДУКАЦЫЙНАЙ МАДЭЛІ

У сваім выступленні рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі **Кацярына Дулава** ўзняла праблемы бесперапыннай адукацыі ў сферы музычнага мастацтва. Прыгадаўшы надзвычай эфектыўную сістэму з больш чым 150-гадовай гісторыяй, пакладзенай у падмурак сучаснай прафесійнай музычнай адукацыі Беларусі, выступоўца задумваецца над пытаннем, які ж цяпер лёс гэтай спадчыны.

— Сёння паспяхова функцыянуе трохступеневая сістэма прафесійнай падрыхтоўкі музыкантаў, — патлумачыла рэктар. — Яна мае дзве разнавіднасці. У першым варыянце шлях будучага музыканта да вяршыні прафесіі праходзіць праз музычную школу, музычны каледж, кансерваторыю. У гэтым ланцужку кожная з устаноў мае аўтаномныя мэты і адукацыйны кантэнт. У другім варыянце адукацыя да паступлення ў кансерваторыю набываецца ў адной установе — гімназіі-каледжы мастацтваў. Гэты вучэбны комплекс дазваляе ажыццявіць бесперапынны адукацыйны працэс, на ўсіх этапах якога захоўваецца дакладная арыентацыя на высокія крытэрыі выканальніцкага майстэрства.

Красамоўныя лічбы: паводле вынікаў уступнай кампаніі ў Акадэмію музыкі за апошнія два гады, 75 працэнтаў першакурснікаў — былыя навучэнцы гімназіі-каледжа.

Яшчэ адна наспелая праблема: пільная патрэба перагляду цяперашніх спецыяльнасцяў для сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі. У агульнадзяржаўным класіфікатары Рэспублікі Беларусь у раздзеле "Мастацтва музычнае", аб'яднаўшым усе музычныя спецыяльнасці, кідаецца ў вочы прыкметная нераўнавага: тры спецыяльнасці на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі, дзесяць — на ўзроўні вышэйшай адукацыі першай ступені, адна — на ўзроўні вышэйшай адукацыі другой ступені.

— І гэта пры ўмовах бесперапыннай адукацыі, якая прадугледжвае наяўнасць музыкантаў усіх спецыяльнасцяў і ў каледжы, і ў ВНУ. Пагадзіцеся, сітуацыя выглядае недарэчна, — дадала спадарыня Дулава.

Рэктар БДАМ прапанавала для новага праекта класіфікацыі спецыяльнасцяў алгарытм узыходжання ад спецыяліста, які валодае рамяством (на базе сярэдняй спецыяльнай адукацыі — пяць спецыяльнасцяў), да сапраўднага майстра сваёй справы, фармаванне якога падаецца магчымым толькі ва ўмовах вышэйшай адукацыі (чатыры спецыяльнасці). Такім чынам, на ўзроўні сярэдняй адукацыі выпрацоўваецца выканальніцтва, на ўзроўні вышэйшай адукацыі — мастацтва. Гэткі падыход паспрыяе ўзбуйненню спецыяльнасцяў, дапаможа зняць дубліраванне спецыяльнасцяў рознага ўзроўню кваліфікацыі і забяспечыць пераймальнасць майстэрства гэтых узроўняў.

Выступоўца не мае сумневу, што вянчаць мадэль бесперапыннай адукацыі музыкантаў мусяць дзве формы паслядыпломнай адукацыі: аспірантура і — як варыянт на гэтым жа ўзроўні — страчаная ў Беларусі на сёння асістэнтура-стажыроўка. Для яе вяртання неабходна распрацаваць змяненні і дапаўненні ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

Яшчэ адзін кампанент, які можа аб'яднаць установы культуры: навукова-адукацыйны творчы кластар. З меркавання Кацярыны Дулавай, у яго, акрамя ўстаноў адукацыі, павінны ўвайсці — у якасці заказчыкаў кадраў — вядучыя канцэртныя і музычна-тэатральныя арганізацыі краіны. Галоўныя ідэі такіх кластараў — аптымізацыя, пошук, адбор, адукацыя і працаўладкаванне таленавітай моладзі. "Гэта перспектыўная мадэль паслужыць упарадкаванню падрыхтоўкі ў сферы мастацтва, выпрацоўцы комплекснага плану дапамогі нашым таленавітым маладым музыкантам", — падсумавала прамоўца.

К

Пайшоў з жыцця народны артыст Беларусі Генадзь Гарбук. Гэта цяжкая страта не толькі для Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, дзе ён працаваў больш за 55 гадоў, — для ўсёй беларускай культуры. І постсавецкай таксама!

Надзея БУНЦЭВІЧ

Ён доўга хварэў, апошні раз выходзіў на сцэну летась у маі — у ролі Цімоха Чарнушкі, бацькі Ганны, у адным са сваіх улюбёных спектакляў "Людзі на балоце". Гэты раман Івана Мележа можа лічыцца скразным у яго жыцці: Генадзь Міхайлавіч удзельнічаў у розных яго ўвасабленнях на тэатральнай сцэне і ў кіно — вядома, у розных ролях. Спярша ён быў Васілём Дзятлікам, закаханым у Ганну Чарнушку. І гэта быў радыёспектакль! Пазней з'явіўся тэлефільм Аляксандра Гутковіча. Нарэшце, узнікла і тэатральная пастаноўка, дзе рэжысёрам выступіў Барыс Эрын. Спектакль быў у рэпертуары больш за 15 гадоў — і ўвесь гэты час Генадзь Гарбук выходзіў на сцэну ў ролі Васіля.

А ў 1981-м Віктар Тураў зняў і па сёння знакамітую стужку (дарэчы, гэта была дылогія "Палеская хроніка", бо праз год з'явілася другая частка — "Подых навальніцы"). Там Генадзь Міхайлавіч ужо стаў бацькам Ганны. Нарэшце, у 2012-м Аляксандр Гарцуеў вярнуў на купалаўскую сцэну мележаўскі раман — не толькі ў новай пастаноўцы, але і ў сваёй уласнай інсцэніроўцы. Так Генадзь Гарбук зноў стаў Чарнушкам. Бачыла купалаўская сцэна і трэцюю частку мележаўскай трылогіі — "Завеі, снежань", дзе Генадзь Міхайлавіч іграў старшыню райвыканкама Івана Апейку.

Здаралася, ён увасабляў і іншаземцаў, і ворагаў. Але ўсё роўна застаўся ў нашай памяці тым героем дый проста чалавекам, які акумулюе ў сабе беларускі нацыянальны характар. Не тыя плакатныя ўвасабленні

Імя Генадзя Гарбука неаднаразова сустракалася на старонках "К", і распавядаў ён пра сябе шмат, але зараз хочацца прывесці некалькі разважанняў артыста, якімі напярэдадні 75-гадовага юбілею ён падзяліўся ў сяброўскай размове з Барысам Крэпакам.

АРТЫСТ І АКЦЁР

— Артыст — гэта мастак, які займаецца "изящными" мастацтвамі: музыкант, жывапісец, скульптар, танцоўшчык, ювелір, фокуснік, спявак. Шавец, каваль ці кухар таксама могуць быць артыстамі. Гэта, наогул, майстар сваёй справы, штукар, дока. Я — акцёр, ад грэчаскага слова aktis ("дзеянне"). Гэта чыста сцэнічнае вызначэнне: кажучы словамі Даля, "лицедей, играющий на театре".

ТЭАТР ЦІ КІНО?

— Тэатр: тут я адчуваю гледача, яго дыханне, апладысменты, маўчанне. Мне гэта бліжэй. Хаця кіно дае іншую перавагу: можна паглядзець на сябе збоку, праз шмат гадоў ацаніць, як ты сыграў ролю. Праўда, гледзячы ў старых стужках на сябе, маладога, іншым разам узнікае настальгія па тых гадах, якія ніколі больш не вернуцца. У кіно — буйны план, і глядач бачыць толькі мае вочы, камера аддаляецца — і ты становішся маленькім фрагментам

Верны сцэне да апошняга

Фота Юрыя ІВАНОВА

прыгнечанага цяжкай доляй лапцюжніка ці шчаслівага калгасніка, а тонкія псіхалагічныя ваганні-хістанні, глыбокі ўнутраны драматызм, заўважны гледачам нават на апошнім радзе балкона. Што ўжо казаць пра кіно: там тыя псіхалагічныя тонкасці артыст выдаваў, бы пад мікраскопам. Дастаткова згадаць хаця б знакамітую стужку "Белыя Росы", дзе ён сыграў старэйшага сына Хвядоса — Андрэя.

У многіх ягоных героях адчуваўся нейкі трагічны надлом, у вачах — спрадвечная беларуская туга, глыбокія душэўныя пакуты. Але гэта не значыць, што ён не ўсміхаўся! Памятаю, як я рабіла з ім інтэрв'ю да яго 80-годдзя — і ён са смехам распавядаў, як яшчэ студэнтам набіў шышак на ілбе не абы-каго, а тагачаснага опернага прэм'ера Ісідара Балоціна.

Генадзь Гарбук — гэта сапраўды тэатральная эпоха. Выхаванец Дзмітрыя Арлова, ён разумеў тэатр гэтак жа, як і яго настаўнік — як "трыбуну для выхавання людзей". І быў верны сцэне да апошняга.

К

1 У 1964 годзе Генадзь Гарбук атрымаў ролю Васіля Дзятліка ў легендарным спектаклі Барыса Эрына "Людзі на балоце".
2 Першая роля Генадзя Гарбука ў вялікім кіно — камандзір партызанскага атрада ў "Паланэзе Агінскага" Льва Голуба (1971 год).
3 Вядомым ва ўсім Саюзе артыст стаў пасля выхаду ў 1983 годзе на экраны камедыі "Белыя Росы", дзе выканаў ролю старэйшага сына ў сям'і Ходасаў — Андрэя.
4 Стужка Міхаіла Пташука "Знак бяды" (1986 год), дзе акцёр сыграў Петрака, увайшла ў першую дзясятку еўрапейскіх фільмаў пра вайну, а партрэт Генадзя Гарбука з'явіўся ў Лонданскім музеі кінамастацтва.
5 У 1987 годзе разам з Інакенціем Смактуноўскім і Леанідам Бранявым Генадзь Гарбук здымаўся ў Парыжы ў фільме Тамары Лісіцыян "Загадкавы спадчыннік".
— Памятаю, здымалі сцэны на Манмартры, — распавядаў Генадзь Міхайлавіч карэспандэнту "К" у інтэрв'ю 2014 года. — Мяне загрыміравалі "пад бамжа". Чакаючы свайго выкліку, адышоў крыху ўбок, прысеў на прыступкі сабора. Раптам нейкая француженка кладзе мне ў руку манету. Я — хутчэй да перакладчыка: "Растлумачце ёй, я ж не жабрак, я артыст!" А той смяецца: "Яна вам за працу заплаціла. — За якую? — Яна вас сфатаграфавала". Яшчэ адну сцэну, дзе я іграў з Уладзімірам Ільіным, здымалі ў рэстаране. Нам далі час толькі да апоўдня, бо пасля туды завітваюць пастаянныя кліенты, рэстаран не хацеў ім перашкаджаць. Знялі з першага дубля, і афіцыянты, што сабраліся "на кіно", ажно запляскалі ў далоні. У гатэлі Інакенцій Смактуноўскі пажартаваў: "Хадзілі чуткі, вам сёння ўвесь Парыж апладзіраваў".
6 У апошні раз гледачы ўбачылі акцёра на сцэне ў спектаклі "Людзі на балоце" — ён з'явіўся 7 мая 2017 года перад публікай у вобразе Цімоха Чарнушкі.
7 Акрамя Васіля, як знакавыя для сябе Генадзь Гарбук вылучаў тэатральныя ролі Дзерваеда з "Радавых", Зёлкіна са спектакля "Хто смяецца апошнім", а таксама дзеда Курылы з "Сымона-музыкі" (2005 год).

Генадзь Міхайлавіч ГАРБУК
(24 ліпеня 1934 — 7 лютага 2018)

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне родным і блізкім народнага артыста Беларусі Генадзя Гарбука ў сувязі са смерцю артыста. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Кіраўніка дзяржавы.

— Свой лёс ён звязаў з тэатрам, прысвяціўшы яму ўсе душэўныя сілы, талент і натхненне. Яго творчая дзейнасць стала неацэнным унёскам у гісторыю сучаснага мастацтва, духоўную скарбніцу Беларусі, прыкладам самаадданага служэння нацыянальнай культуры і сваёй Айчыне, — гаворыцца ў спачуванні.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што Генадзь Гарбук выхаваў некалькі пакаленняў таленавітых артыстаў, якія годна прадстаўляюць, развіваюць і памнажаюць найлепшыя традыцыі беларускай тэатральнай школы.

Тэатральнае мастацтва Беларусі панесла незаменную страту: 7 лютага 2018 года пайшоў з жыцця народны артыст Беларусі Генадзь Міхайлавіч Гарбук.

Генадзь Гарбук нарадзіўся 24 ліпеня 1934 года ў вёсцы Глыбачка Ушацкага раёна Віцебскай вобласці. У 1958 годзе скончыў акцёрскі факультэт Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута па спецыяльнасці "Акцёр драматычнага тэатра" (курс народнага артыста БССР Дзмітрыя Арлова). У Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы працаваў з 1962 года.

Генадзь Гарбук адносіцца да найлепшых прадстаўнікоў, захавальнікаў і прадаўжальнікаў купалаўскай выканальніцкай школы, артыстаў вышэйшага майстэрства і тыповага нацыянальнага характару.

За 50 гадоў працы ў Купалаўскім тэатры акцёр стварыў звыш 80 разнастайных вобразаў. Сярод мноства бліскучых роляў артыста асабліва вылучаюцца: Сымон у спектаклі "Раскіданае гняздо" Янкі Купалы, Андрэй Буслай ("Парог" Аляксея Дударава), Зёлкін ("Хто смяецца апошнім" Кандрата Крапівы), Акцёр ("На дне" Максіма Горкага), Гастрыт ("Вечар" Аляксея Дударава), Жыгалаў ("Вяселле" Антона Чэхава), Дзед Курыла ("Сымон-музыка" Якуба Коласа), Ціхон Пратасавіцкі ("Пінская шляхта" Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча), Кучэра ("Не мой" паводле Алеся Адамовіча), Чарнушка ("Людзі на балоце" паводле Івана Мележа), Палкоўнік ("Лістапад. Андэрсен" паводле Алены Паповай). Псіхалагічна насычанай і складанай тэхнічна стала роля Бацькі ў спектаклі "Тата" Дзмітрыя Багаслаўскага.

У 2014 годзе Генадзь Гарбук адзначыў свой 80-гадовы юбілей творчым вечарам "Песні майго жыцця", дзе публіка ўбачыла яго ў ролі чулага спевака-выканаўцы.

У 1966 годзе за выкананне ролі Васіля Дзятліка ў тэлевізійным спектаклі "Людзі на балоце" паводле Івана Мележа ўзнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй Беларусі. У 1984 годзе за выкананне ролі Чарнушкі ў мастацкім фільме "Людзі на балоце" — Дзяржаўнай прэміяй СССР. У залатую скарбонку айчыннага кінематографа ўвайшлі вобразы, створаныя Генадзем Гарбукам у кінафільмах і тэлевізійных пастаноўках "Трэцяе пакаленне", "Трывожнае шчасце", "Плач перапёлкі", "Дзень вяртання", "Белыя Росы", "Бусляня", "Талаш" і шмат іншых.

У 1995 годзе Генадзь Гарбук стаў уладальнікам медаля Францыска Скарыны. У 2004 годзе акцёр атрымаў Спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у 2007 годзе — прэмію "За духоўнае адраджэнне", у 2010 годзе — прэмію Беларускага саюза тэатральных дзеячаў "Крыштальная Паўлінка".

Гарбук Генадзь Міхайлавіч — гэта сапраўды нацыянальны здабытак нашай краіны, вялікі Артыст і Грамадзянін. Мастацтва Генадзя Гарбука аказала неацэнны ўплыў на развіццё сучаснай беларускай акцёрскай школы, зрабіла значны ўклад у прапаганду культуры Беларусі.

Светлая памяць аб выдатным творцы, чалавеку шырокай душы назаўжды застанецца ў памяці родных, блізкіх, сяброў, калег і шматлікіх гледачоў.

Ю.П.Бондар, І.У.Дрыга, П.І.Палякоў, М.М.Пінігін, Э.І.Герасімовіч, С.М.Кавальчык, А.А.Старых, М.Д.Краснабаеў, А.В.Яфрэмаў, А.В.Сцебакова, А.Ф.Гарцуеў, У.М.Карачэўскі

"Заклік да святла, дабра і хараства — гэта маё"

у палатне фільма. Затое ў тэатры, калі ты змяняеш адносіны да персанажа, маеш магчымасць трохі "перакроіць" вобраз. У кіно ж — ніколі...

ПЕРШАЯ РОЛЯ НА КУПАЛАЎСКАЙ СЦЭНЕ

— Гэта была п'еса "Футбол" Кантэна і Белака (у арыгінале — "Рэгбі"). Я іграў аднаго добрага хлопца, якога, праўда, ужо ў першым акце забіваюць. Ставіў спектакль Відаўскі, а галоўным рэжысёрам тэатра тады быў Юрый Шчарбакоў. Тую ролю выконваў, калі не памыляюся, у 1962 годзе.

ДАГЛЕДЖАНАЯ ЗЯМЛЯ

— З дзяцінства не люблю запушчанай ці закінутай, занядбанай зямлі. Зямля павінна быць заўсёды дагледжанай: відаць, гэта — ад маіх сялянскіх каранёў. Мае продкі з Ушаччыны — чыстай вады земляробы, для якіх зямля — гэта ўсё. Сам я магу працаваць на сваёй "фазэндзе" з раніцы да ночы. Асабліва люблю вазіцца з бульбай. Можна сказаць, я — прафесійны бульбавод: вырошчваю бульбу па галандска-бельгійскай методыцы, і, кажуць, у мяне добра атрымліваецца. Лецішча — не толькі здавальненне, але і здаровы лад жыцця. Для мяне — гэта найлепшая "крэпатура" цела: не трэба ніякіх салярыяў, турэцкіх пляжаў, альпійскіх лугоў.

ЖЫЦЬ "ПА ПРАЎДЗЕ"

— Мой блізкі сябра Раман Філіпаў калісьці кінуў такую фразу: "Калі ў прадмеце мастацтва ёсць заклік да святла, дабра і хараства — гэта маё. Калі гэтага няма — гэта не маё..." Лепш не скажу. І яшчэ часта ўспамінаю блізкага мне па духу Васіля Макаравіча Шукшына, які казаў: "Маральнасць ёсць праўда" і "Не забыць бы, што мы людзі". А што тычыцца ўласна прафесіяналізму, дык на гэты конт у майго настаўніка Дзмітрыя Аляксеевіча Арлова аднойчы прагучала такая думка: "Беражы партнёра. І ў непагадзь цёплым шалем ухутай яго, а не сябе". Вось я і стараюся жыць "па праўдзе" — і ў жыцці, і на сцэне, і на здымачнай пляцоўцы...

Вытрымкі з інтэрв'ю 2009 года, № 31

КУЛЬТУРА WWW.KIMPRESS.BY № 6 / 10 ЛЮТАГА 2018 г.
Art-блог 9

Ад батлейкі да двухбояў на шаблях

Арт-суполка імя Тадэвуша Рэйтана, каардынатарам якой з'яўляецца пастаянны аўтар "К" Зміцер Юркевіч, знаходзіць усё новыя спосабы папулярызацыі сродкамі мастацтва знакавай для беларускай гісторыі асобы. Фестываль "Рэйтан", які пройдзе 17 лютага ў Мінску, уражвае не толькі планаваным маштабам — здавалася б, недасягальным для купкі рупліўцаў. Як падаецца, арганізатары вырашылі ахапіць літаральна ўсе ўзроставыя групы і задаволіць усе эстэтычныя густы. І толькі дзеля адной мэты — каб пра 245-я ўгодкі Варшаўскага сейму, на якім здзейсніў свой мужны ўчынак патрыёт ВКЛ, даведаліся нават тыя, каго мінуўшчына зусім не цікавіць.

Ілья СВІРЫН

Праграма фэсту, што мае доўжыцца дванаццаць гадзін, запоўніўшы ўсе тры залы вялізнай арт-прасторы "Верх", — багатая на разнастайнасці. Для дзетак — батлейка і майстар-класы па вырабе лялек. Для "прасунутых" аматараў гісторыі — дыспуты з навукоўцамі. Для моладзі — рок-канцэрт. Для аматараў відовішчаў — бойкі на шаблях ды іншыя атракцыйныя рэканструкцыі. Усяго й не пералічыць! Своеасаблівым жа "цвіком" імпрэзы абяцае стаць маштабная тэатралізаваная дзея, у якой гістарычную тэматыку выканаўцы "ўкладаюць" у спецыфічную мову перформанса.

Паважнае месца ў праграме займае сучаснае мастацтва. Але й тыя, хто аддае перавагу больш традыцыйным рэчам, не застануцца без увагі. Вялізная выстава, што стане важнай часткай фэсту, аб'ядноўвае самых розных паводле эстэтычных перакананняў аўтараў — гэткіх прызнаных майстроў, як Рыгор Батальёнак, Алесь Родзін, Валерый Вядрэнка, і мастакоў новай генерацыі.

Мае адбыцца на фэсце й яшчэ адна добрая падзея — прэзентацыя дзвюх мемарыяльных дошак, што неўзабаве будуць усталяваны на родавай капліцы Рэйтанаў у Грушаўцы. Варта азначыць: разам з іншымі дошкамі на гонар дзеячаў беларускай гісторыі, гэтыя на мецэнацкіх пачатках вырабіла адна з прыватных фірм падчас выставы, прысвечанай камнеапрацоўцы.

Першы інфармацыйны шчыт на тэрыторыі сядзібы Рэйтанаў быў усталяваны на суботніку, арганізаваным сябрамі арт-суполкі сумесна з журналістамі нашай рэдакцыі. Усцешна, што памяць пра слынны род будзе ўшанавана цяпер і мемарыяльнай дошкай. К

"ПлаStформа" паміж рухам і сэнсам

Адкрыты форум эксперыментальных пластычных тэатраў "ПлаStформа", які ўжо шосты раз пройдзе на наступным тыдні ў Мінску, вяртаецца да былых маштабаў. Гэта ізноў паўнавартасны фэст, які ладзіцца на розных пляцоўках, мае замежных удзельнікаў і, што самае важнае, дэманструе шырокую панараму той мастацкай з'явы, якой ён прысвечаны. Хаця, паводле не зусім добрай традыцыі, праводзіцца форум па-ранейшаму з намаганняў і энтузіязму кіраўніка "ІнЖэста" Вячаслава Іназемцава ды яго паплечнікаў.

Ілья СВІРЫН

Доўгачаканая прэм'ера культавага тэатра "Генезіс, або Паходжанне Відаў" мусіла стаць цэнтральнай падзеяй форуму. Ды, на жаль, захварэў адзін з актораў, і таму ледзь не ў апошні момант спектакль быў перанесены ў часе. Тым не менш, праграма фэсту застаецца насычанай і ўключае як паўнафарматныя пастаноўкі, даўно ацэненыя публікай і крытыкай, так і шматлікія экзерсісы. Аншлагавыя "Інтэрв'ю з вядзьмаркамі" і "Бетон" Яўгена Карняга, безумоўна, дадаюць "ПлаStформе" вагі, але найбольшая яе каштоўнасць — магчымасць азнаямлення з некаторымі (каля)тэатральнымі практыкамі, абвесткі пра якія зазвычай у мінскай афішы адсутнічаюць.

Вечары сучаснай харэаграфіі і перформансу збяруць добрую гагорту як прызнаных ужо, гэтак і пакуль малавядомых аўтараў. А група Structurers ізноў прапануе ўсім ахвотным далучыцца да імправізацыйнай дзеі ў фірмовым фармаце харэаграфічнага хэпенінгу, калі сціраецца мяжа між выканаўцамі і публікай.

Уключае праграма фэсту таксама й шматлікія лекцыі ды майстар-класы. Прычым, разлічаны яны не толькі на маладых актораў і танцораў, але й на зацікаўленых гледачоў, якія хочуць як найглыбей пазнаць сучасныя тэатральныя і перфарматыўныя формы, паўсталыя між рухам і сэнсам. К

Femina як камп'ютарны монстр

Камерны Team Theatre, стацыянарная зала якога разлічана ўсяго на 30 месцаў, існуе крыху больш за год. Аднак яго шматлікія ініцыятывы ўжо на слыху не толькі ў родным Гомелі, але і ў сталіцы. Днямі ў Нацыянальным цэнтры сучаснага мастацтва быў прэзентаваны гомельскі спектакль "Джуманджы" — паводле міні-п'есы-дзённіка Femina maxime сучаснага расійскага пісьменніка Сяргея Патапава. Падзея атрымала добрае анансаванне, пазіцыянуючыся як "вельмі дзіўны спектакль" — іншымі словамі, смелы эксперымент.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Крытыкаў на гомельскім спектаклі было малавата, дый аншлагу, якім вылучаецца тэатральная зала НЦСМ, не назіралася. Магчыма, яшчэ і таму, што адначасова на славутай купалаўскай сцэне ішоў перадпрагляд "Рэвізора" Мікалая Пінігіна, куды запрасілі ўсе СМІ. Так што абмеркаванне "Джуманджы" не было запланавана — шкада. Бо такія размовы даволі часта ладзяцца пасля дыскусійных сучасных пастановак — і гамяльчане гэта практыкуюць!

Не ведаю, ці былі ў залі тыя, хто "купіўся" на "раскручаную" назву, вядомую па кнізе, фантастычных стужках, мультсерыяле, настольнай гульні. Калі так, яны маглі расчаравацца: спектакль не мае ніякага дачынення да таго трылеру. Змест п'есы адпавядае яе арыгінальнай назве — Femina maxime. Прыблізна зразумець гэта лацінскае словазлучэнне здольны кожны, не задумваючыся пра дакладны пераклад: штосьці накшталт "максімальнай жанчыны". Але змена назвы, жанравае азначэнне спектакля — гульня, ды яшчэ спасылкі ў анатацыі да тэсту Цьюрынга, скіраванага на распазнаванне ў суразмоўцы жывога чалавека ці камп'ютара, збіваюць магчымыя арыенціры. Прачытаўшы папярэдне п'есу, разумееш: рэжысёр Вольга Чарненка ўчабыла яе па-свойму, не проста як маналог ракавой жанчыны ці постмадэрнісцкую спасылку "насуперак" на "Пяшчоту" Анры Барбюса. Калі герой французскага аповеду атрымліваў лісты ад каханай, якая не вынесла расстання і скончыла жыццё самагубствам, дык гераіня п'есы напалохана пасмяротнымі эсэмэскамі, што рэгулярна прыходзяць ад закаханага ў яе чалавека, якога яна і не збіралася ратаваць у час аварыі, хаця была абавязана яму сваім жыццём.

Алеся Бардухаева-Арол.

Праўда, тое жыццё не стала бязвоблачным. Яна прайшла праз алкагольную і наркатычную залежнасці, змагла своечасова іх пазбавіцца. Атруціла мужа-бізнесмэна, прадала нованароджаную дачку чорным трансплантолагам. Прыдбала востраў, дзе вырашыла развіваць дайвінг-турызм. Закахалася ў альфонса, які абрабаваў яе і з'ехаў. "Заказала" пакаранне свайго крыўдзіцеля. І — загінула ад цунамі. Дык хто нам усё гэта распавядаў — прывід гераіні? Ажыўшы камп'ютарны монстр? Невыпадкова экраны жылі "ў такт" жаночаму аповеду, а рухі гераіні, суправаджаючы прачытаныя ёй эсэмэскі, перагукаліся з адметнай "робатапластыкай" перапіскі ў чаце — у іншым спектаклі іншых аўтараў ("Сіндром Медэі" ў РТБД).

Спектакль не тлумачыць, хто ж быў перад намі. Цягам свайго маналогу гераіня паступова выключае змешчаныя на сцэне чатыры маніторы — адначасова з кожным наступным перыядам свайго жыцця і смерцю чарговага мужчыны. А калі знікае яна сама, на сцэну выскоквае зусім не віртуальны мужчына, зноў уключае і наладжвае камп'ютарную сетку. "Ну што, згуляем?" — запытвае ён, завяршаючы спектакль вар'іраванай рэпрызай (у пачатку спектакля гераіня таксама запытвала залу: "Ну што, пачнем?"). У пастаноўцы некаторыя падрабязнасці зменены, іншыя — скарочаны. Словы ж "пачнем", "згуляем" — дададзены. Як і фінальная неаднаразова паўтораная фраза камп'ютара: "Вы можаце пачаць гульню".

"Джуманджы" па-гомельску

Толькі дзе тая гульня — не ў камп'ютарным, а тэатральным сэнсе? Гледачы застаюцца простымі назіральнікамі. Сінхронныя "карцінкі" на экранах — звыклымі камп'ютарнымі "шпалерамі", што адпавядаюць пэўнай сітуацыі па сваім настроі, але вырашаны ў розных стылістыках (ад абстрактнай "колерамузыкі" да рэалістычнага чорна-белага дажджу і мульяшнага лася, што ілюструе "лашару Пецю"). Сувязь з сюжэтам "Джуманджы" — хіба ў тэме здрады, за якую даводзіцца расплочвацца, у жаданні "напужаць" гледачоў, раз-пораз асляпляючы іх пражэктарам. У астатнім — усё наадварот. Там — гульня дыктавала свае правілы. Тут — гераіня жыве не па правілах чалавечнасці і любові. Праўда, аднойчы ўзнікаюць іншыя паралелі — са словам. Па-японску "джуманджы" азначае распяцце, і ў адной з мізансцэн артыстка кладзецца на падлогу акурат у позе "крыжа", раскінуўшы рукі.

У Алесі Бардухаевай-Арол — вельмі пачуццёвы нізкі тэмбр, багаты на абертоны. Цяжкі погляд, якім яна здатная літаральна спапяліць (можа, таму і загарэўся аўтобус, дзе загінуў яе выратавальнік?). Але гэтай цудоўнай актрысе яшчэ трэба ўдасканальваць маўленне, пераадольваць аднастайнасць інтанацый. Сэнсавыя акцэнты расстаўляюцца выключна за кошт паўз, якімі вылучаюцца пэўныя словы. А ёсць жа безліч іншых прыёмаў! Няўжо іх адсутнасць — таксама следчанне механічнага, "нечалавечага" ў гераіне? А сам "камп'ютарны" паварот тэмы — ці ж не спрошчванне абранай вострай праблематыкі? Жыццё ж не "перайграеш" наноў...

Team Theatre шукае сваю культурную нішу, імкнецца да сучаснай тэатральнай эстэтыкі. І хай пакуль гэта першыя крокі навобмацак, пажадаем камандзе (менавіта так перакладаецца назва тэатра) плёну на складаным шляху. К

Інвентарызацыя ілюзій

Бляклыя выцвілыя старонкі, на якіх "разбягаюцца" па невядомых траекторыях чырвоныя і сінія вугалкі для фатаграфій. Зімовыя краявіды, нібыта спехам, у адвольным парадку сабраныя ў контур срэбнай рамы. Чорна-белыя фота дзяўчыны на фоне маляўнічай натуры. Прыглядзеўшыся, на здымку нібыта 60-гадовай даўніны я пазнаю ў незнаёмцы, што замерла ў трошкі тэатральнай позе, сучаснага фатографа Аляксандру Салдатаву. Як такое можа быць? І што гэта ўсё значыць?

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

"Наша падарожжа" цягнецца да 24 лютага.
Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

У Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў ідзе выстава "Наша падарожжа" медыямастачкі Сашы Салдатавай. Аб'ектам даследавання аўтара стаў феномен рамантычнага фотаальбома і фатаграфіі, якую мы імкнёмся захаваць "на памяць" пра асаблівыя моманты жыцця.

Да паглыблення ў тэму Аляксандру падштурхнуў альбом 1950-х гадоў, знойдзены на блашыным рынку ў Брусселі. "Гэта была дакументацыя адпачынку адной бельгійскай пары на Мальёрцы, — распавядае аўтарка. — Нічога асаблівага. Звычайны клішыраваны альбом, зроблены, відавочна, для таго, каб потым паказваць яго сваім сябрам. Але мне захацелася зрабіць штосьці падобнае. Прычынапіць уласнае шчасце да пэўнага моманту часу".

Кіруючыся правіламі гульні знойдзенага артэфакта, мастачка пачала рабіць фотаздымкі нібыта ўласнага шчаслівага трыпу — капіраваць позы гераіні брусельскага альбома, шукаць месцы, якія б адпавядалі адлюстраваным на старых фатаграфіях.

У пачатку падарожжа на адным са здымкаў дзяўчына стаіць ля трапа самалёта "Аэрафлота" з сумкай у руцэ. Вось яна ўжо красуецца на фоне адметнай будыніны — адна рука на таліі, другая — у кішэні. А вось дзяўчына на балконе кватэры, з якога адкрываецца "від на горад". Поза Аляксандры ўжо даволі напружаная, яна глядзіць трошкі стомлена на таго, хто яе фатаграфуе.

Гэта не проста інсцэніроўка чужых фатаграфій, гэта пагружанне ў іншыя стасункі. Аўтарка прызнаецца, што чым больш яна ўжывалася ў вобраз, тым больш відавочнай станавілася фальш усёй канструкцыі ідыліі ў цэлым. Што імкнулася захаваць тая далёкая пара, фіксуючы адно аднога на фоне прыгожых відаў Мальёркі? Безумоўна, тое ж, што і ўсе мы, выпраўляючыся ў падарожжа. Фатаграфія выступае ў якасці доказу самога факта нашай вандроўкі, становіцца пацвярджэннем таму, што мы сапраўды былі ў тым самым месцы і моманце. Хто ведае, мабыць і шчаслівымі?

Вось і сам альбомчык, у якім фігурна абрэзаныя фотакарткі, налепленыя на кардон, прыкрывае тонкая папера. Нашы ўспаміны "ўпакаваны" туды з асаблівай стараннасцю — адмысловыя выразы ў старонках для адбіткаў, вугалкі і подпісы, "паціна" празрыстай паперы — усё скіравана на тое, каб прыдаць нашым ілюзіям яшчэ большую каштоўнасць, прадоўжыць жыццё мінулага.

Сучасны фотаальбом на падобную раскошу прэтэндаваць не можа. Сёння доказы нашай прысутнасці ў экзатычных месцах захоўваюцца на камп'ютарных вінтэсцерах. Што будзе, калі ўсе гэтыя фотаздымкі разам надрукаваць? Якіх памераў дасягнуць нашы "ўспаміны"? Праект "Усе", які працягвае развагі мастачкі, уяўляе з сябе цэлую плойму лічбавых фотаздымкаў, раздрукаваных на паперы і сабраных у асобную кнігу. Пейзажы Венецыі, на іх фоне фігуры, вылучаныя колерам. Гэта таксама чыёсці падарожжа, і яго фіксацыя не менш аднастайная.

Сотні фотаздымкаў... У гэтай, здаецца, бясконцай лічбавай плыні прыгожых карцінак так нескладана ўбачыць сваё адлюстраванне. Ты гэтаксама рабіў фатаграфіі, рэагуючы на новую прастору і адчуванне сябе ў ёй. Таксама імкнуўся захаваць момант сваёй сапраўднай ці штучнай ідыліі.

"Падарожжа" прыводзіць да высновы, што лічбавыя выявы Венецыі, зробленыя сучаснікамі, зімовыя пейзажы лесу, выкананыя невядомым фотааматарам у 1930-я, фіксацыя закаханай пары на Мальёрцы ў 1950-я, маюць пад сабой агульную глебу. Гэта акт фатаграфіі як радасці прысутнасці. Так, сучасным лічбавым альбомам усё больш дастаецца лёс няздзейсненага артэфакта. Але яны па-ранейшаму выкрываюць чалавечую слабасць да "тых самых" момантаў і іх прыдумвання сродкамі фатаграфіі.

Ды ўсё ж, калі зман раскрыты, яго чароўнасць зусім не губляецца. Інвентарызацыя ілюзіі не пазбаўляе нас ад прызнання ўласнай сентыментальнасці. Што з таго, калі ў гэтым успаміне няма нічога сапраўднага? Або яно даўно знікла. Стасункі, гады, людзі... Фатаграфія, застаючыся сюррэальнай, у адзін дзень раптам прапаноўвае нам штосьці больш за тое, што мы прасілі. Яна не проста распавядае нам праўду, яна яе прад'яўляе. Яе празрыстае маўчанне распускаецца нязнанай кветкай. І мы плачам над звычайным адбіткам. К

Кіно для пацалункаў

Калі хтосьці хоча правесці вечар у апошнім шэрагу кіназалы з каханай дзяўчынай — вам дакладна на новую камедыю Аляксандры Бутар "У асабістую прастору ўваход забаронены". Лёгкая, разлічаная на моладзь рамантычная стужка рэжысёра нашумелых "Белыя росы. Вяртанне" і "Салодкае развітанне Веры" мае ўсе прыкметы "кіно для пацалункаў": прыемныя акцёры, нескладаны сюжэт — і, на жаль, дрэнная рэжысура, якая дазваляе без праблем адхіляцца ад дзеяння на экране.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Няхай даруюць мне прыхільнікі Аляксандры Бутар, але яе незалежны праект аказаўся далёка не шэдэўрам. "У асабістую прастору ўваход забаронены" — праца, якую рэжысёр выпусціла на базе сваёй творчай майстэрні "Тэрыторыя кіно". У новы фільм укласліся сябры аўтаркі — гурт "Тяни-Толкай" і святочнае агенцтва "Арт-Апетыт". Да прамоўшна стужкі далучылася літоўскае прадзюсарскае агенцтва Baltic Open. Можна толькі ўзрадавацца таму, што на нашым абмежаваным рынку з'явіўся яшчэ адзін суб'ект кінавытворчасці — кампанія, здольная зрабіць сваё кіно і прасунуць яго на вялікі экран, які для беларускага кінематографа адкрыты надзвычай выбарачна. Аднак вытворчы поспех Аляксандры ніяк не перакрыў правалу яе новай карціны ў мастацкім плане.

Сюжэт фільма такі. Малады праграміст Макс, які кіруецца ў жыцці рынцыпамі перфекцыянізму, завяршае новую камп'ютарную гульню. Спакою яму не дае адна недапрацоўка — роўна на два градусы не дакручваецца руля танка. Для Макса такая хіба — кшталту катастрофы. Але яго кіраўнік лічыць інакш — і без сумневаў выпускае новую гульню ў продаж. Не вытрымаўшы падобнай — выключна ўласнай — паразы, герой з'язджае ў правінцыю, на невядомы чыгуначны прыпынак "Лясны", дзе ён і сустракае шалапутную дзяўчыну Машу. Эмацыйная і адкрытая, яна пераймаецца зусім іншымі праблемамі. Сустрэча маладых людзей, як можна прадказаць, змяняе іх погляд на свет і на каханне.

Паралельна з галоўнай лініяй развіваецца гісторыя стасункаў пары медыкаў, а гэтаксама ўмоўны канфлікт паміж бацькам маладой спявачкі Зіны і яе прадзюсарам па пакліканні Жэням, які хоча, каб дзяўчына прыняла ўдзел у конкурсным адборы на "Еўрабачанне".

Здавалася б, усе маркеры сучаснага жыцця навідавоку: праграміст з перфекцыяністкімі "загонамі", дзяўчына, што шукае ўвагі, малады прадзюсар, які здымае кліп сваёй сяброўцы, выкарыстоўваючы тыя рэсурсы, што мае пад рукой... І тым не менш. Галоўнай праблемай, якая не дае кіно Аляксандры Бутар адбыцца, з'яўляецца штучнасць.

Свежыя і прыемныя акцёры — Эрык Абрамовіч, Любоў Клок, Ганна Палупанава, Кацярына Самойла... Але іх пераўтварэння з тыпажоў у вобразы, за рэдкім выключэннем, не адбываецца. Ёсць пачын меладраматычнай гісторыі — але яна захрасае і ператвараецца ў "мыла". Само дзеянне ўвогуле распадаецца на асобныя часткі, дзе ёсць пэўныя сцэны — сустрэча галоўных герояў, Максім і Маша прыходзяць у кавярню, той момант, калі з'яўляецца хлопец Машы, альбо калі Мікалаіч, гаспадар кавярні і бацька таленавітай Зіны, грае на гітары ў нейкай каморцы...

"У асабістую прастору ўваход забаронены". У галоўнай ролі Эрык Абрамовіч.

Гэтыя часткі — бы кавалкі цэлага, якія мусяць скласціся ў адно палатно, лёгкую і рытмічную меладраму. Аднак дзеянне то запавольваецца, то паскараецца, матывы герояў то пазначаюцца "пункцірам", то, як у выпадку з дзяцінствам Макса, выпісваюцца так падрабязна, што нават млосна становіцца. Стужка Аляксандры Бутар склалася па законах зробленай працы, але яна не адбываецца на ўзроўні кіно, дзе кожны яго кампанент сумуецца ў адзінае цэлае.

Ёсць гук, але дзеля таго, каб разабраць рэплікі акцёраў, часам даводзіцца напружвацца. Безумоўна, прыцягваюць увагу асобныя прыгожыя кадры, але чамусьці ў цэлым працу аператара ацаніць складана. Сцэнарый... Як ужо адзначалася, ёсць тры лініі, якія перакрыжоўваюцца, але дыялогі і матывы герояў зроблены схематычна.

З аднаго боку — залішняя літаральнасць, з іншага — дзіўныя нестыкоўкі. Да прыкладу, Мікалаіч успамінае сваё "рокавае" мінулае ў закрытым памяшканні. Гітара грыміць, Мікалаіч "валіць" рок, але яго ніхто не чуе. І літаральна праз пэўны час, выпадкова зайшоўшы ў каморку, Зіна даведваецца пра "сакрэт" таты. Праз адчыненныя дзверы мы ясна чуем голас Жэні, які кліча дзяўчыну. Якім чынам, калі прастора кавярні настолькі абмежаваная, Зіна не магла чуць рэпетыцый бацькі?

Аляксандра Бутар, якая ў свой час зрабіла прарыў, зняўшы "Паўлінку-New" у рэчышчы тагачасных навагодніх гламурных тэлемюзіклаў, сапраўды ўмее здымаць тэлевізійную прадукцыю. Досвед буйных праектаў дадаў упэўненасці ў сваіх сілах і вытворчай школы. Аднак разуменне таго, як і што павінна быць зроблена, зусім не засцерагае рэжысёра ад уласнай творчай абмежаванасці. "У асабістую прастору ўваход забаронены" — фільм серыяльнага ўзору, дзе даміную схематычнасць сюжэту і вобразная непрапрацаванасць. Публіка, што цікава, нават можа ахвотна аддаць сябе ў палон падобнага "мыла" — бо мы хочам гісторый з добрым канцом і лёгкім гумарам. Аднак і камерцыйны прадукт патрабуе большай аддачы. І, як можна ўпэўніцца, справа тут не толькі ў грошах. К

Экспрэс да станцыі “Танцулькіна”

Галоўныя навіны дасылаюцца на адрас рэдакцыі, безумоўна, з сёлетняй культурнай сталіцы Беларусі — Наваполацка. Як паведаміла спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Наваполацкага гарвыканкама Ганна Казакова, днямі распачалася акцыя “Лілея сяброўства”, якая цягам года адлюструе творчую сувязь культурнай сталіцы-2018 з гарадамі-пабрацімамі. А такіх у Наваполацка аж 20 — з Латвіі, Расіі, Кітая. Адкрыў праект канцэрт-лёсаванне творчых калектываў агульнаадукацыйных школ.

Яўген РАГІН

А рэй у названай справе, зразумела, будуць весці работнікі культуры. У плане гарадскіх мерапрыемстваў — самыя разнастайныя майстар-класы, святы нацыянальных кухань, тэатралізаваныя дзеі і канцэрты. 5 — 6 лютага ў горадзе прайшлі творчыя сустрэчы з паэтам-земляком Навумам Гальпяровічам, які святкуе 70-гадовы юбілей. А на пачатак сакавіка запланавана ўрачыстае гашэнне паштовай маркі “Наваполацк — культурная сталіца Беларусі”.

Творчае жыццё віруе і ў іншых рэгіёнах краіны. Наступная навіна наўпрост звязана з чарговым прыемным і, як падаецца, доўгатэрміновым знаёмствам. Загадчык аддзела метадычнай работы **Ашмянскага** раённага цэнтра культуры Канстанцін Яраш напісаў ліст пра тое, як сельскі клуб вёскі **Будзёнаўка** днямі пераўтварыўся ў... чыгуначную станцыю. Ад яе экспрэс “Зімовыя забавы” адправіўся да станцыі “Танцулькіна”. Так, самы сапраўдны экспрэс, дзе нават вагон-рэстаран меўся. Пасажыры куплялі білеты, цягам вандроўкі іх суправаджалі вакалісты з ансамбляў “Сустрэчы” і “Чаромха”. Аляксандр Пашкоўскі граў на флейце. Дзяцей забаўляў майстар па аквагрыму, на “пероне” — пляцоўцы ля клуба — прадаваліся сувеніры. Акцыя для сельскага клуба, скажам, — нестандартная. Хто ж прыдумаў такую? Звязаўся з кіраўніком Будзёнаўскага СК. Пазнаёміліся: Настасся Дорняк, 28 гадоў, скончыла Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў, працуе ў сферы культуры дзесяць гадоў, летась стала загадчыцай клубнай установы. Ідэю экспрэса Насця “нарадзіла” разам з мастацкім кіраўніком клуба Валянцінай Горыд. Так трымаць, дзяўчаты! З радасцю я даведаўся і пра тое, што спадарыня Дорняк сёлета будзе паступаць на завочнае аддзяленне ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Пажадаем ёй удачы ў гэтай пачэснай справе!

Як і заўжды, Ашмяншчына актыўнічае ў справе эпісталярных стасункаў з “К”. Піша настаўнік па класе скрыпкі **Ашмянскай** дзіцячай школы мастацтваў Таццяна Чэрская: *“На аддзяленні ФСД (фартэпіяна, скрыпка, духавыя інструменты) стала традыцыяй штогадовае правядзенне тэматычнага тыдня, прысвечанага пэўнаму музычнаму інструменту. Калі школьнае жыццё — разнастайнае, тады і навучанне — паспяховае. Адзін з апошніх тыдняў студзеня каралевай школы стала вытанчаная і чарадзейная скрыпка. Настаўнік па класе скрыпкі Ірына Асмольская разам з вучнем 7 класа Уладзімірам Гіруцем дала адкрыты ўрок.*

У актавай зале быў арганізаваны кіналекторый “Скрыпачы XXI стагоддзя”. Адна з класных гадзін называлася “Развіццё самастойнасці на заняткох у класе скрыпкі”. Гаворка ішла пра ўменне рацыянальна выкарыстоўваць час для навучання. На Таццянін дзень з канцэртам выступілі Таццяны: Каралёва, Печкур і я. А ў заключным канцэрце майстэрства дэманстравалі вучні 1 — 2 класаў”.

Тэму Дня ўсіх Таццян працягвае намеснік дырэктара **Галышанскай (Ашмяншчына)** дзіцячай школы мастацтваў Дар’я Антановіч. На базе класаў аграгарадка **Баруны** адбыўся канцэрт. Госці маглі пазнаёміцца з гісторыяй, традыцыямі свята. Выступілі салісты-інструменталісты, вакальныя калектывы.

Інфармацыйную эстафету пераймае намеснік дырэктара **Ашмянскай** дзіцячай школы мастацтваў Таццяна Печкур. Яна распавядае пра тое, што вучань другога класа — баяніст Ягор Кетрыс (настаўнік Марыя Лопух) — стаў стыпендыятам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Ужо на першым годзе навучання Ягор стаў лаўрэатам III ступені III Міжнароднага фестывалю-конкурсу “Новыя вяршыні — 2017”, які праходзіў у Мінску. Першая сур’ёзная перамога натхніла. Не за гарамі, думаецца, і наступныя.

Да 80-годдзя з часу ўтварэння **Віцебскай** вобласці аддзел бібліятэчнага маркетынгу цэнтральнай бібліятэкі ЦБС **Браслаўскага** раёна падрыхтаваў пазл-акцыю “Мая Віцебшчына”. Загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ Ірына Макарэвіч і дырэктар установы Вольга Ляснеўская растлумачылі сутнасць акцыі. З рознакаляровых пазлаў усіх раёнаў трэба сабраць выяву вобласці. Справу распачалі чытачы, работнікі арганізацый і ўстаноў горада. У лютым своеасаблівая карта рушыць у падарожжа па бібліятэках сістэмы.

Галоўны бібліятэкар па арганізацыйна-маркетынгавай дзейнасці **Гродзенскага** раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра Людміла Трубчык агучвае лозунг бібліятэкараў усіх часін і народаў: чытачоў шмат не бывае! Менавіта таму ва ўстановах вобласці сістэмна ладзяцца мерапрыемствы па прыцягненні новых аматараў кніг, асабліва — дзяцей і падлеткаў. **Верцялішкаўская** сельская бібліятэка як інфармацыйна-краязнаўчы цэнтр сабрала другакласнікаў на літаратурную гульню “Цудоўны свет бібліятэкі”. А **Скідзельская** гарадская бібліятэка сямейнага чытання арганізавала для выхаванцаў дзіцячага садка агляд перыядычных выданняў “Часопісны калейдаскоп”. Будучыя чытачы знаёміліся з правіламі карыстання кніжкамі, з паняццем “фармуляр”.

Супрацоўнік аддзела бібліятэчнага маркетынгу са **Шчучына** Віталій Рубанаў распавядае, якім чынам бібліятэкі раёна святкуюць 210-годдзе з дня нараджэння Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. 2 лютага **Навадворская** сельская бібліятэка накіравалася ў завочнае падарожжа “Дарогамі Дуніна-Марцінкевіча”. Са школьнікамі правялі віктарыну, прысвечаную жыццю і творчасці пісьменніка. 3 лютага ў **Васілішкаўскай** СБ прайшла літаратурная гадзіна, прысвечаная нацыянальнай драматургіі Дуніна-Марцінкевіча. Інтэграваная бібліятэка аграгарадка **Дэмбрава** спынілася на жыцці і творчасці класіка. Гаворка ішла пра стаўленне аўтара да фальклору. У бліжэйшы час падобныя акцыі пройдуць у **Куляшоўскай**, **Каменскай**, **Гурнофельскай** бібліятэках.

Бібліятэкар дзіцячай бібліятэкі **Быхава** Кацярына Якаўлева абагульняе дзейнасць сваёй установы за 2017 год. Установа займаецца прапагандай здаровага ладу жыцця сярод дзяцей і падлеткаў. Рэалізоўвалася праграма “Бібліятэка — тэрыторыя здаровага стылю”. Да яе падключыліся адукацыйныя ўстановы, райбальніца, цэнтр гігіены і эпідэміялогіі. Поруч з друкаванымі выданнямі выкарыстоўваліся і відэаматэрыялы на CD-носьбітах. Відэалекторыі сталі традыцыйнымі. Падчас летніх вакацый бібліятэкары ладзілі адпаведную працу ў летніках.

4 лютага ў аграгарадку Дворышча Лідскага раёна ўжо ў пяты раз адбылося свята бліноў “Бліны ды аладкі — усё вясны-красны нагадкі”. Як напісала нам вядучы метадыст Лідскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці Вольга Троцкая, упрыгожаная сцэна, мноства яркіх лакацый для фатаграфавання, смачныя бліны ды аладкі рознай таўшчыні ды велічыні, добрыя музыкі, вясёлыя артысты і скамарохі, а таксама мноства народных і спартыўных забаў прыемна здзівілі гледачоў, якія прыехалі ў Дворышча з Ліды і навакольных вёсак. Таксама ў дзень свята гледачы атрымалі магчымасць наведаць новы турыстычны аб’ект — комплекс “Вольны мельнік” і сустрэцца з рыцарамі Сярэднявечча.

На здымках:
1 Пазл-акцыя "Мая Віцебшчына" распачата.
2 Ашмяны: ўдзельнікі Тыдня скрыпкі.
3 Вось ён які, баяніст Ягор Кетрыс.
4 Быхаўскія бібліятэкары Кацярына Якаўлева і Вольга Круталевіч.
5 Будзёнаўка спявае.
6 У Гальшанах шануюць Таццян.

К

Малады дырыжор Павел ЛЮБАМУДРАЎ, які некалькі гадоў таму вярнуўся ў родную Беларусь пасля заканчэння Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі, ужо крыху "саліраваў" на старонках "К" (гл. № 20 за 2015 г.), прэзентуючы створаны ім аркестр "Метамарфоза". Гэтаму творчаму калектыву, што цяпер існуе не сам па сабе, а пры Беларускім саюзе музычных дзеячаў, пайшоў трэці год. Дык як жыве аркестр, атрымліваючы не стабільны заробак бюджэтнай установы, а толькі разавыя ганарары? Можа, ён проста выжывае? На гэтыя ды іншыя нашы пытанні адказаў мастацкі кіраўнік.

Надзея БУНЦЭВІЧ

"Метал-марфозы" аркестра

"Сярод нашых аркестрантаў ёсць і студэнты Акадэміі музыкі. Але найперш гэта знаныя музыканты. Сабраўся поўны сімфанічны склад! Канцэртмайстрамі, да прыкладу, выступаюць такія выбітныя скрыпачы, як Юлія Стэфановіч і Алег Подаў.

— За два з гакам гады мы падрыхтавалі і паказалі публіцы больш як 20 праграм. І гэтак адказалі скептыкам, якія не верылі ў жыццяздольнасць калектыву. Бо ўвесь гэты час трымаліся мы пераважна на энтузіязме, любові да музыкі, жаданні граць ды павышаць сваё прафесійнае майстэрства. З мінулага году, заўважыўшы дзейнасць аркестра, нам пачаў дапамагаць Беларускі саюз музычных дзеячаў. Мы яму вельмі ўдзячны! Саюз ажыццяўляе юрыдычнае суправаджэнне нашых канцэртаў, бярэ на сябе іншыя арганізацыйныя клопаты. Раней гэтым займаўся мастак, супрацоўнік БСМД Сяргей Салохін. Справа не спынілася і пасля яго смерці. Прытым, што мы не адзіны творчы калектыў пад апекай Саюза.

— Хто ж у складзе аркестра? Мабыць, адно пачаткоўцы, якіх грэе сама думка пра сцэну прафесійную?

— Зусім не. Сярод нашых аркестрантаў ёсць і студэнты Акадэміі музыкі. Але найперш гэта знаныя музыканты. Сабраўся поўны сімфанічны склад! Канцэртмайстрамі, да прыкладу, выступаюць такія выбітныя скрыпачы, як Юлія Стэфановіч і Алег Подаў. Яны перадаюць свой вопыт — і калектыў, да ўсяго, становіцца для творчай моладзі яшчэ і добрай выканальніцкай школай. Не дзіва, што з нашым аркестрам саліруюць многія выдатныя музыканты, лаўрэаты міжнародных конкурсаў: піяніст, выкладчык Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі Станіслаў Салаўёў, нашы віяланчэлісты — Мікаэл Самсонаў, які апошнім часам жыве і працуе ў Германіі, і Максім Барбаш, які працягвае вучобу ў Маскоўскай кансерваторыі, а таксама скрыпачка Юлія Лебядзенка, якая вучылася ў Вене, флейтыстка, салістка аркестра Марыінскага тэатра Марыя Фядотава, гітарыст Юрый Няхай і многія іншыя.

— І ў гэтым спісе вашых "калабарацый" асабліва вылучаецца ваяўнічы амерыканскі метал-гурт Manowar...

— У Мінску рок-музыканты захацелі сыграць з аркестрам, і арганізатары канцэрта звярнуліся да нас. Мы выступалі ў нязвыклых для нас умовах — у Палацы спорта. Пасля ўступнай кампазіцыі, якую мы выконвалі "на разагрэў", яшчэ да выхаду гурта, з залы раптам пачулася: "Першая скрыпка — залік!" А сабраліся ж там выключна прыхільнікі цяжкага рока. Пасля канцэрта некаторыя жартавалі, што аркестр можна пераймяноўваць: маўляў, "Метамарфоза" стала "Метал-марфозай".

— Музычнае выканальніцтва — мастацтва хуткаплыннае. Ці спрабавалі вы некалі "спыніць імгненне", зразумеўшы, што яно было дасканалым?

— Маюцца на ўвазе запісы? Так, мы іх робім, у тым ліку і на Беларускім радыё. Але ёсць і трансляцыйныя, здзейсненыя непасрэдна ў час канцэртаў — узровень аркестра гэта дазваляе. Таму творы ў выкананні нашага калектыву можна лёгка знайсці ў інтэрнэце. На аснове запісаў у сталічным касцёле Святога Роха мы выпусцілі кампакт-дыск з "Порамі года" Антоніа Вівальдзі — там усе чатыры канцэрты: "Вясна", "Лета", "Восень", "Зіма". Зірніце, які цікавы дызайн вокладкі! Дрэва, але незвычайнае. На розных яго галінах адлюстраваны ўсе чатыры прыродныя станы, што адпавядаюць і порам чалавечага жыцця, дарэчы. Наладзілі супрацоўніцтва з аўтарытэтнай італьянскай кампаніяй: аддаём ёй свае запісы, а яна распаўсюджвае іх праз інтэрнэт-крамы.

— Як фармуеце рэпертуар? Бачу, не баіцеся выстаўляць на афішы вельмі папулярныя творы, што маюць безліч сапраўды "эталонных" гучанняў.

— Пры складанні праграм арыентуемся не толькі на высокі мастацкі ўзровень твораў, многія з якіх былі апрабаваны часам, але і на слухацкую аўдыторыю. Імкнёмся, каб музыка была максімальна даступнай на ўспрыманне і адначасова выхоўвала добры густ, бо на нашых канцэртах бывае многа моладзі. Таму без папулярнай класікі папросту не абысціся! І колькі б ні мелася яе выдатных запісаў, кожны выканаўца мае права на сваю інтэрпрэтацыю. Ды й жывое гучанне непараўнальнае ні з якой "алічбоўкай"!

— А ці не забываецеся вы на сучасных беларускіх кампазітараў?

— Не забываемся. Прычым, выконваем не толькі вядомыя партытуры, але і новыя: гралі "Тоўсты сшытак" Аляксандра Літвіноўскага і "Зачараванне няздзейсненай мары" Аляксандра Пажарыцкага. Гучала беларуская музыка і ў нашых навагодніх праграмах. Так, у Палацы прафсаюзаў выконвалі Сімфанічную паэму Настассі Бяндэрскай — нядаўняй выпускніцы Акадэміі музыкі па класе прафесара Уладзіміра Дарохіна. Гэта была яе дыпломная работа, але на іспыце паэма гучала ў камп'ютарнай версіі. Да згаданага канцэрта Наста зрабіла другую рэдакцыю. Гэтая вельмі меладычная, прыгожая музыка не "згубілася" побач з "Шахеразадай" Рымскага-Корсакава, "Ноччу на Лысай гары" Мусаргскага, "Рамэа і Джульетай" Чайкоўскага: менавіта на гонар гэтых кампазітараў канцэрт быў названы "Калядныя зоркі".

— На святы выступленняў больш?

— Так. Да пералічанай праграмы далучыўся "Навагодні канцэрт" у зале "Верхні горад". Гэтая сцэна для нас асаблівая: менавіта на ёй адбылося калісьці першае выступленне нашага аркестра.

— Залы розныя — творы тыя ж?

— Ні ў якім разе! Другі згаданы канцэрт быў зусім іншым, нават паводле стылістыкі. Бо да "Пораў года" П'яцолы дадаліся кампазіцыі з рэпертуару Фрэнка Сінатры. А ў яго "ролі" выступіў саліст ансамбля "Камерата" Аляксей Бурдзелеў.

— Як шукаеце салістаў? Ці яны самі да вас прыходзяць? Маўляў, хочам выступіць з аркестрам.

— Ініцыятыва зазвычай сыходзіць ад мяне. Літаральна днямі, 8 лютага, у зале Дома літаратараў выступалі з Уладзіславам Плігаўкам — сусветна знакамітым баяністам нашай беларускай нацыянальнай выканальніцкай школы. Лаўрэат больш як 30-ці прэстыжных міжнародных конкурсаў, уладальнік Кубка свету. Гэтага музыканта рады бачыць і чуць у любой краіне. Але ад таго, каб чарговы раз пагграць разам з аркестрам, не адмовіцца ніводзін добры саліст. Бо такая магчымасць — гэта, можна сказаць, партнёрства экстра-класа. Таму ўсе, да каго б я ні звяртаўся, заўсёды адгукаюцца з задаваленнем. Тым больш, што праграму яны абіраюць самі: наш аркестр у стане падрыхтаваць і выдатна выканаць любы прапанаваны твор.

Ну, а надалей спрацоўвае "сарафаннае радыё". Тыя, хто ўжо выступаў з намі, раяць наш калектыў іншым. Асабліва актуальна гэта для маладых замежных выканаўцаў. Падам прыклад. Я ўжо згадваў: мы маем трывалыя сувязі з Мікаэлам Самсонавым, у красавіку зноў з ім выступаем. І ён рэкамендаваў наш аркестр сусветна вядомай кітайскай скрыпачцы. Цьяньва Янг прафесарнічае ў музычных акадэміях Германіі, некалькі разоў па выніках сваіх аўдыязапісаў станавілася Чалавекам года. І ўвосень прыедзе да нас! А вось слыннаму польскаму гітарысту Марціну Дыле прапанаваў пагграць з "Метамарфозай" я асабіста. Яшчэ і таму, што паводле сваёй першай прафесіі я таксама акадэмічны гітарыст.

— Вось цікава. А я і не ведала!

— Так. Я скончыў Мінскі музычны каледж імя Глінкі, пасля па гэтай жа спецыяльнасці два гады вучыўся ў Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі — і толькі потым змяніў гітару на дырыжаванне. Марцін Дыла заўсёды быў адным з маіх гітарных куміраў. Апошнім часам ён жыве ў ЗША, выкладае ў Сан-Францыска — і гастралюе па ўсім свеце. Прычым, выконвае не толькі сусветна вядомыя гітарныя "хіты", але і творы польскіх кампазітараў. Дзе б ні граў, заўжды папулярызуе найлепшую польскую музыку. І гэта правільна! А Польскі Інстытут, у сваю чаргу, падтрымлівае яго паездкі. Менавіта дзякуючы гэтай установе, стане магчымым прыезд Марціна Дылы і ў Беларусь.

— Вам, пэўна, таксама хацелася б граць не адно ў Мінску. Ці магчымыя сёння гастролі такога калектыву, як ваш, хаця б па краіне? Пра замежжа я ўжо маўчу.

— На жаль, наўрад ці. 21 лютага мы выступаем у Палацы прафсаюзаў — толькі аркестр, без салістаў. Граем творы Бетховена, Чайкоўскага, Сібеліюса. Там камерным складам не абыдзешся — на сцэне будзе 40 чалавек. А цяпер падлічыце, колькі могуць "пацягнуць" транспартныя паслугі, калі мы такую праграму паспрабуем вывезці ў Гродна, Брэст, Маскву, Пецярбург. Дарэчы, гэтыя гарады я назваў невыпадкова: там гатовы былі б нас прыняць, але адсутнасць фінансавай падтрымкі аркестра замінае творчасці.

— Дык усё ж як жывяце? Ці можна сказаць адным словам — няблага?

— Я прапанаваў бы іншае слова: шукаем. Бо мы і сапраўды шукаем самыя розныя магчымасці. А хто шукае — заўсёды знаходзіць.

К

Галоўны захавальнік музея Святлана Лявонцьева і дырэктар Галіна Нячаева.

А школа — Веткаўская!

Пазалетась дэлегацыя горада Екацярынбурга наведала з афіцыйным візітам Магілёў. Узначальваў яе старшыня гарадской думы Екацярынбурга Яўген Ройзман, вядомы не толькі як грамадскі дзеяч, але і як збіральнік цудоўнай калекцыі ўральскіх абразоў, даследчык іканапісу, заснавальнік музея "Няўянская ікона". Знайшоў час Яўген Вадзімавіч і для таго, каб пабываць у Веткаўскім музеі стараабрадніцтва і беларускіх традыцый імя Фёдара Шклярава.

Жаданне яго наведаць узнікла натуральна, бо ўральскія стараабрадцы былі звязаны з веткаўскімі. Кіраўнік Екацярынбурга прабыў у нас каля трох гадзін, зацікаўлена абмяркоўваў асаблівасці ўральскіх і веткаўскіх ікон, агледзеў багатыя і арыгінальныя экспазіцыі трох музейных паверхаў і ў выніку быў надзвычай уражаны. Выказаўся на гэты конт каротка: "Нічога сабе! А казалі — раённы музей..." Пакінуў установе некалькі рэдкіх выданняў па ўральскім іканапісе і гісторыі свайго музея ды пасяброўску развітаўся.

РАСПАКАВАЛІ — І АХНУЛІ

Але гісторыя мела працяг. Восенню мінулага года нам патэлефанавалі з Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі ў горадзе Екацярынбургу. Паведамілі, што Яўген Ройзман выразіў перадаць у дар Веткаўскаму музею старадаўнюю ікону. Даставілі яе ў Мінск пры садзейнічанні некалькіх арганізацый і неабыякавых людзей і ўручылі нам у Міністэрстве замежных спраў. Яна была старанна запакаваная і апячатаная.

Распакавалі ўжо ў музеі і ахнулі. Перад намі — вялікая (54х43х3 см) і грунтоўна адрэстаўраваная ікона "Іаан Прадцеча" з "Дэісуса". І што галоўнае — веткаўскай школы іканапісу! Добрай работы, з залатым фонам і чаканным арнаментам па залачоным ляўкасе. Сталі фатаграфаваць — і заўважылі на адвароце дошкі дату: 1865. Вось такая падзяка Яўгена Вадзімавіча за экскурсію па Веткаўскім музеі!

СІМВАЛ АХВЯРЫ

Гэтая ікона — правая частка трыпціха "Дэісуса", дзе ў цэнтры адлюстраваны Хрыстос, злева — Багародзіца, а справа — Іаан Прадвеснік (Хрысціцель). Як сцвярджае Евангелле, ён быў непасрэдным папярэднікам Ісуса Хрыста, прадказаў прыйсце Месіі і стаў апошнім старазапаветным прарокам, які, сыходзячы ў пекла, першым прынёс туды вестку пра Збаўленне.

Гістарычнасць Іаана Хрысціцеля не адмаўлялі нават атэістычныя савецкія навукоўцы. Ён носіць эпітэты *Хрысціцеля* і *Прадвесніка* як той, хто хрысціў Хрыста, і як той, хто прыйшоў з пропаведдзю перш за яго, у адпаведнасці са старазапаветнымі прароцтвамі.

Прарок і аскет традыцыйна малюецца ў грубым вярблюджым адзенні — валасяніцы. З дзяцінства і да свайго 30-годдзя ён жыў у пустэльні, куды яго прывёў анёл. Паверх валасяніцы — плашчгімацій, у нашых мясцінах яго выяўлялі часцей за ўсё ў зялёным або земляным колеры. На іконе ў левай руцэ прарока — чаша, у ёй — сімвалічнае адлюстраванне Богадзіцяці. Правай рукой Іаан указвае на Хрыста, а глядзіць на нас.

Вобраз Іаана з чашай вядомы з XVI стагоддзя. Гэта намёк на яго прарочыя словы пра місію Ісуса: "*Се Агнец Божий, вземляй грехи мира*". Далей сімвал асэнсаваны ў плане Еўхарыстыі (літургіі і прычашчэння). Прадвеснік трымае ў чашы Таго, "*кто приходит заклатися и датися в снедь верным*".

Ікона 1865 года "Іаан Прадцеча" — падарунак Веткаўскаму музею з Екацярынбургу.

Але з такою чашаю прарок звычайна паўстае на асобнай іконе, дзе ён выяўлены ў поўны рост і з анёльскімі крыламі. Абраз мае паэтычную назву "Іаан Прадцеча — Анёл пустыні". Там прыводзяцца і словы прароцтва: "*Азъ видехъ и свидетельствовахъ...*" Такія ж словы ёсць і на падоранай іконе. Аднак у "Дэісусе" ў мінулыя часы Іаан звычайна быў выяўлены з малельным жэстам да Хрыста, са скруткам, без чашы з Дзіцём.

А што наконт веткаўскіх трыпціхаў "Дэісуса"? Яны ўсе падаюць вобраз Хрысціцеля з чашай. Некалькі "Дэісусаў" з устойлівай іканаграфіяй падобнага тыпу ўпрыгожваюць экспазіцыю музея. Побач з імі знайшоў сваё месца і падараваны абраз. Ён нібыта ўзмацніў сімвалічны змест кампазіцыі, прымусіў па-новаму яе ўбачыць. Да таго ж, мы настолькі прызвычаіліся да дэісуснага абраза з чашай, што лічылі яго звыклым. Атрымліваецца, мясцовая іканаграфія аб'ядноўвае два сімвалічныя сюжэты?

Аналізуючы выяўленчы матэрыял, можна заўважыць, што ў іканапісе вобраз Іаана "з чашаю" фарміруецца ў пострасколькі перыяд і распаўсюджаны больш за ўсё менавіта ў Ветцы. У іншых месцах такі тып сустракаецца адзінкава. Два прыклады мы знайшлі ў стараабрадніцкім Неўянску (першай паловы XVIII і XIX стагоддзя) і адзін у Раманаўскіх пісьмах (таксама XIX стагоддзя).

У абодвух цэнтрах іканапісу ведалі пра майстроў з Веткі! Наша школа спазнала свой росквіт у XVIII стагоддзі. Барочныя рысы жывапісу спалучаюцца ў ёй з традыцыйнымі іканапіснымі прыёмамі яшчэ візантыйскага паходжання.

СВЯТА Ў АСКЕЗЕ

Можна вылучыць гіпотэзу: так аб'яднаць два сюжэты (Дэісус — маленне і чашу з Хрыстом) на Ветцы імкнуліся асэнсавана.

Дэісусны сэнс — абраз малення за людзей Іаана і Марыі (яны глядзяць на гледача, духоўна кантактуюць і заклікаюць да ўзаемадзеяння, дыялогу). Прычым сімвалічны і рытарычны аспекты аб'ядноўваюцца і ўвасабляюцца ў стылістыцы, уласцівай толькі Ветцы. Гэта маглі быць і сацыяльны, і духоўны сэнсы ўшанавання вольнага горада. Стараабрадцы канца XVII — XVIII стагоддзяў маглі збірацца на супольную малітву толькі на землях Вялікага Княства Літоўскага. Тут заснавалі Ветку з яе Пакроўскім храмам, тут узаконілі старую абраднасць.

Вобраз аскета — адзін з сімвалаў старой Веткі. Тут у скітах, у адзіноце лясной "пустэльні" працавалі і маліліся сотні людзей. Як сцвярджае мясцовы летапіс, "*любя в безмолвии жити*". Другім бокам жыцця была прага свята і прыгажосці як праўды. Яна і паяднала вобразы аскета — з яго прарочым заклікам і пранікнёным зваротам да чалавека — і райскай квецені, узнагароды за вернасць.

А паясны іканастас з трох ікон быў вельмі распаўсюджаны сярод жыхароў Веткі. Ён "хатні" па памерах, але святочны нават у аскезе.

Галіна НЯЧАЕВА, дырэктар Веткаўскага музея стараабрадніцтва і беларускіх традыцый імя Фёдара Шклярава

У сталіцы праходзяць дзве выставы, прысвечаныя 90-годдзю з дня нараджэння народнага мастака Беларусі Уладзіміра Стэльмашонка: "Мастак і Чалавек" у Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага і "Жывыя малюнкі, вобразы, сімвалы..." ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ / Фота Паліны КАСМАЧОВАЙ

Уладзімір Стэльмашонак — знакавая постаць у айчынным выяўленчым мастацтве. Яму належыць выключная роля ў фарміраванні ўласна беларускай мастацкай школы — хай сабе і ў рэчышчы агульнасавецкай культуры, але з выразнымі рысамі нацыянальнай ментальнасці. Мастак скончыў ленінградскі Інстытут імя Рэпіна, які фактычна з'яўляецца спадкаемцам Імператарскай акадэміі. Вучыўся ў класіка сацыялістычнага рэалізму Барыса Іагансона. Магчыма, калі б пасля абароны дыплома пагадзіўся на зробленую яму прапанову застацца ў Ленінградзе, сёння ў расійскім мастацтве было б на аднаго класіка болей.

Аднак Уладзімір Стэльмашонак прыняў лёсавызначальнае для беларускага мастацтва рашэнне вярнуцца ў Мінск. Выкладаў у тэатральна-мастацкім інстытуце, моцна паўплываў на

Выстава Меера Аксельрода, які рэалізаваў сябе пераважна як графік і тэатральны мастак, праходзіць у Беларусі ўпершыню. Паказальная і тэматыка, з якой мастак вярнуўся ў нашу краіну. Ураджэнец Маладзечна, ён пачаў свой мастацкі шлях у Мінску, але пасля быў адпраўлены на вучобу ў вядомы ВХУТЕМАС і застаўся ў Маскве. Далейшы яго жыццёвы шлях быў звязаны з тым горадам. Там ён і стварае сваю першую серыю работ аб зверствах нацыстаў. Паняцце Халакосту яшчэ не існавала, аднак канцэптуальнае асэнсаванне мастаком трагедыі яўрэйскага народа ўжо тады было цалкам відавочным.

Тэматыка зверстваў нацыстаў у гады вайны праходзіць далей праз усё жыццё мастака. Пасля вяртання з эвакуацыі ён вывучае мноства дакументальных матэрыялаў пра мэтанакіраванае знішчэнне яўрэяў і сутыкаецца з жывымі сведчаннямі тых, хто ўсё бачыў сваімі вачыма. Вынікам пакутлівага ўнутранага пражывання падзей вайны стала графічная серыя "Гета",

Майстар ва ўсім

Сваякі мастака.

Уладзімір Стэльмашонак. Мінск. Канец 1940-х — пачатак 1950-х, аловак

6 лютага народнаму мастаку Беларусі Уладзіміру Стэльмашонку споўнілася б 90 гадоў.

Пра настаўніка

светапогляды, а часам і на аўтарскі почырк цэлай кагорты маладых тады мастакоў, чые імёны сёння на слыху. Нездарма сталыя творцы з цеплынёй згадваюць Уладзіміра Іванавіча — свайго настаўніка.

Выстава ў галерэі Савіцкага — ужо сама па сабе сімвалічная падзея. Міхаіл Андрэевіч і Уладзімір Іванавіч належаць да аднаго пакалення, болей за тое — былі сябрамі. І галоўнае, яны — постаці аднаго гістарычнага маштабу, вартыя адзін аднаго паводле таленту і ўплыву на культурны працэс. У галерэі прадстаўлены творы, якія дазваляюць прасачыць творчую эвалюцыю мастака ад традыцыйнага рэалізму з даважкам імпрэсіяністычнай стылістыкі да манументальнай абагульненасці, сціслай палітры і эфектнага дэкаратывізму. Сталая творчасць майстра сваёй энергетыкай прымушае згадаць рэвалюцыйны авангард 1920-х гадоў. Безумоўную гістарычную каштоўнасць і цікавасць для мінчукоў-патрыётаў горада ўяўляюць ягоныя майстэрскія замалёўкі краявідаў сталіцы, якая яшчэ не заляпчыла раны вайны, але ўжо глядзіць ў заўтрашні дзень.

Аўтапартрэт. 1990 год.

Імпрэза памяці Уладзіміра Стэльмашонка ў Музеі Якуба Коласа зыходна планавалася як выстава адной карціны — хрэстаматыйнага партрэта класіка літаратуры. Гэты шэдэўр захоўваецца ў Нацыянальным мастацкім музеі. З просьбай пазычыць твор для экспанавання ў Коласавым доме дырэктар Зінаіда Камароўская звярнулася да свайго калегі Уладзіміра Пракапцова. Той у адказ прапанаваў зрабіць экспазіцыю з шасці палотнаў, уключаючы і аўтапрартрэт мастака. Так атрымалася невялікая, але эмацыянальна і сэнсава ёмістая персанальная выстава, дапоўненая дакументамі з архіва сям'і Стэльмашонкаў.

На адкрыцці выставы прысутнічалі сваякі, сябры і калегі творцы. Пранікнёнае слова пра нашага класіка сказаў старшыня Беларускага саюза мастакоў Рыгор Сітніца, які высока ацаніў творчую спадчыну Стэльмашонка, ягоную незвычайную здольнасць дасягаць плёну ў розных іпастасях — ад майстра акварэлі і малюнка да аўтара мазаік і вітражоў. Таксама спадар Сітніца згадаў, што Уладзімір Іванавіч ачольваў Саюз мастакоў у пераломныя гады і нямала зрабіў дзеля захавання творчай супольнасці ў не надта спрыяльных для мастацтва ўмовах.

Сын мэтра Сяргей — таксама мастак — выказаў прысутным ад імя сям'і ўдзячнасць за памяць пра бацьку. Ён згадаў, што Уладзімір Іванавіч калісьці даў яму дзве парады, якімі Сяргей кіруецца дагэтуль. Першая — заўжды мець пад рукамі нататнік і маляваць у ім. Такім чынам нават час, праведзены ў транспарце па дарозе на працу, не будзе змарнаваным. Другая — калі малюеш, не спяшайся ўключаць галаву: давярай эмоцыям, і рука сама выведзе на патрэбную форму.

Мяркуючы па творчых дасягненнях Сяргея Стэльмашонка, бацькоўскія парады пайшлі яму на карысць.

Уладзімір Іванавіч Стэльмашонак. Настаўнік, старэйшы сябар, як мы яшчэ называлі адзін аднаго — "катковец": Уладзімір Іванавіч хадзіў у студыю Сяргея Пятровіча Каткова пасля вайны, я — у 1960-я.

Уладзімір Іванавіч быў кіраўніком майго дыплома на манументальным аддзяленні Тэатральна-мастацкага інстытута, і далей я ўдзельнічаў у ягонай творчай групе, якая працавала над аздабленнем Дома літаратара. Калі я вёў студыю выяўленчага мастацтва ў Палацы культуры чыгуначнікаў, Уладзімір Іванавіч абавязкова наведваў нашыя (ці маю, ці дзяцей) выставы. Гэты раён быў яму блізкім: тут ён пэўны час жыў, тут жа была і ягоная майстэрня.

На дзесяцігоддзе студыі "Квецень", якая ўжо мела званне народнай, упершыню быў выстаўлены макет будучага цэнтра эстэтычнага выхавання, які выканалі са мною старэйшыя студыйцы, што скончылі на той час архітэктурны факультэт. Дзякуючы "прабіўным здольнасцям" Уладзіміра Іванавіча і падтрымцы неабыякавых людзей, праект быў рэалізаваны, але, шчыра кажучы, рэчаіснасць не спрыяла ягонаму далейшаму развіццю.

Уладзімір Іванавіч з'ехаў у Маскву дэпутатам, і цэнтр без ягонай апекі паціху згас. Але і далей наша сяброўства працягвалася. Ён запрашаў на свае выставы мяне, я — яго. І гэтак штогод. Да ягонай хваробы.

Памятаю апошнюю выставу акварэляў Уладзіміра Іванавіча ў Нацыянальным мастацкім музеі. Хоць ён усміхаўся, было відаць, што мастак мусіць прыкладаць намаганні нават каб кніжку сваю падпісаць... Але пры гэтым ён здолеў зрабіць сваім сябрам і мастацкай грамадзе прыгожае свята.

Вось і ў мяне ў майстэрні вісіць на сцяне малюнак Уладзіміра Іванавіча з ратамскім краявідам, падораны мне на тым апошнім вернісажы. Я гляджу на яго і з удзячнасцю згадваю майго настаўніка і старэйшага сябра.

Алесь КВЯТКОЎСКІ

Тэрапія праз пакуты

"Лёс уратаваў яго ад лагераў і душагубак, але ён ўзышоў на гэтую Галгофу як мастак". Такі эпіграф да выставы "Нямецкая акупацыя ў графіцы Меера Аксельрода", якая праходзіць у віцебскім Арт-цэнтры Марка Шагала, у поўнай меры адпавядае яе трагічнаму зместу. Невыпадкова адкрыццё адбылося акурат напярэдадні Міжнароднага дня памяці ахвяр Халакосту, што адзначаецца 27 студзеня. Выстава, арганізаваная Музеем Марка Шагала ў Віцебску, Фондам Аляксандра Пячэрскага і Галерэяй "Вэлум", уключае кніжныя ілюстрацыі і эскізы да іх, эскізы да карцін, алоўкавыя накіды. Цэнтральнае месца займае серыя "Нямецкая акупацыя" ("Зверствы немцаў"), створаная у гады вайны.

Эскіз да карціны "Расстрэл".

над якой мастак працаваў у другой палове 1960-х гадоў.

Меер Аксельрод скончыў свой зямны шлях у студзені 1970 года. Ён дажыў да часу, калі паняцце Халакосту і яго асэнсаванне ў рэлігійным ключы стала шырока выкарыстоўвацца на Захадзе. Праўда, у Савецкі Саюз яно прыйшло значна пазней.

Творы Аксельрода, застаючыся сведчаннем памяці, у сваім метафізічным змесце ўжо выйшлі за межы пэўнага гістарычнага часу і набылі звышгістарычнае значэнне, якое мае адносіны да першапрычын катастроф, што адбываюцца ў прасторы чалавечага космасу. У графіцы мастака мы бачым сканцэнтраваныя пакуты ўсяго чалавецтва, калі асобнымі дзяржавамі з рэальным ці жаданым імперскім статусам пачынаюць авалодваць сілы Апраметнай. Аднак узнікненне твораў, падобных графічным работам Меера Аксельрода, сведчыць пра надзею на тое, што параза чалавечага пачатку ў чалавеку ўсё ж з'яўляецца часовым фактарам у гісторыі.

Аб гістарычных каранях прадстаўленых графічных твораў распавядала на адкрыцці выставы віцебская мастацтвазнаўца Людміла Вакар: "Работы такога зместу ўспрымаць вельмі складана. Але гэта своеасаблівая духоўная тэрапія, якая правярае ўнутраную глыбіню чалавека. Прадстаўленыя працы маюць вялікае мастацкае значэнне. Яны адносяцца да традыцыі перадрамантызма, калі ў мастацтва прыходзіць герой не алегарычнага зместу, а народ, які пакутуе і бунтуе. І яркім прыкладам тут можа быць творчасць Франсіска Гойі. Мы памятаем яго цыкл "Бедствы вайны", памятаем яго "Расстрэл паўстанцаў у ноч на 3 мая 1808 года"... Менавіта гэтыя работы сугучныя творам Меера Аксельрода. У іх сканцэнтраваны пакуты і той гераізм, з якім гэтыя мукі пераносяцца. Творы вучаць стаяць прад бядой, захаваўшы пры гэтым сілу духа і чалавечнасць".

Эскіз ілюстрацыі да кнігі Рывы Рубінай "Уецца ніць".

Тое, што сярод экспанаваных работ мастака мы бачым пераважна эскізныя творы, зусім не зніжае каштоўнасці самой выставы. Эскізы, выкананыя вялікім майстрам, могуць яшчэ больш акцэнтавана выказваць ідэю ці яе прыватныя аспекты, перадаючы першапачатковыя перажыванні і эмоцыі, у дадзеным выпадку — чалавечы боль.

Уладальнік калекцыі і куратар выставы Ілья Васільеў на цырымоніі адкрыцця дзяліўся ўспамінамі са свайго дзяцінства, калі самае моцнае ўражанне выклікалі аповеды пра пакуты вайны тых, хто праз іх прайшоў. Цяпер яго задачай з'яўляецца перадаць гэта веданне наступным пакаленням. Як адзначыў Ілля Васільеў, мастак гаворыць з гледачом праз свае творы наўпрост, без пасярэднікаў.

Скарбніцу культуры Беларусі складаюць унёскі розных нацыянальнасцей, рэлігій і канфесій. Яўрэйская культура з'яўляецца адной з частак адзінага беларускага космасу. Тое, што ў гады вайны яна бязлітасна знішчалася разам з яе носьбітамі, ёсць трагедыя і для беларусаў. Тэму памяці развіваў на адкрыцці выставы галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Дзяніс Юрчак: "Гэтая выстава сведчыць, што мы памятаем нашу гісторыю, якая цесна пераплеценая з яўрэйскім народам. Мы памятаем трагедыю віцебскага гета і іншых падобных месцаў".

Будучы мастаком намінальна савецкім, Меер Аксельрод заўсёды заставаўся перш за ўсё сынам свайго народа як у жыцці, так і ў творчасці — і менавіта гэтым ён найбольш цікавы. Але не варта забывацца і пра месца яго нараджэння. Цяпер Маладзечна будзе дамагацца вяртання імя Меера Аксельрода, як гэта было ў Віцебску з імём Марка Шагала.

Георгій КАРЖАНЕЎСКІ

Цікавей за прыгодніцкі серыял

У свой 210-ы юбілей Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч зрабіўся сапраўднай медыяперсонай. Пра шалёныя піруэты яго жыцця (а яны ніяк не саступаюць біяграфіям сучасных "сэлебрытыс") пісалі многія цэнтральныя СМІ. А чытачы, трэба думаць, вывучалі — з цікаўнасцю. І ўсё гэта дзякуючы актыўнасці нашага пастаяннага аўтара — гісторыка-архівіста Змітра Дразда. Яго публікацыі адкрываюць усё новыя і новыя эпізоды жыцця знаёмага, здавалася б, яшчэ са школьнай лавы класіка.
Гэтым разам даследчык тлумачыць, навошта ён вырашыў засяродзіць увагу не на творчасці пісьменніка, а на таямніцах яго біяграфіі. І прапануе развянчаць некалькі ўстойлівых міфаў, датычных гэтай персоны.

МЕЛАДРАМА, КАМЕДЫЯ, ДЭТЭКТЫЎ...

Чаму так складася, што большасць жыхароў Беларусі значна лепш ведаюць пра жыццё расійскіх паэтаў і пісьменнікаў, чым пра сваіх родных? Мабыць, справа тут не толькі ў тым, што ў нашых школах творчасць першых часцяком выкладаюць як нейкую вяршыню сусветнай культуры, а другіх — як нешта местачковае, другаснае.

Варта прыгадаць, што за апошняе дзесяцігоддзе ў Расіі былі знятыя новыя захапляльныя фільмы і нават серыялы пра Пушкіна, Лермантава, Дастаеўскага, Гогаля, Ясеніна... Прычым фільмы гэтыя сучасныя ва ўсіх сэнсах слова, і класікі там — не бронзавыя ідалы, а жывыя людзі, чые несмяротныя творы нараджаліся ў неверагоднай буры жыццёвых падзей і ўнутраных хістанняў, пачуццяў і страсцей. Постаці з падручніка там выяўленыя зусім не як беспахібныя героі: яны сумняюцца, здзяйсняюць памылкі, а часам нават дрэнныя ўчынкі. Як і кожны смяротны.

І тут, напэўна, крыецца галоўная прычына пройгрышу нашых класікаў іх расійскім калегам. Мы практычна нічога не ведаем пра жыццё тых людзей, якія стваралі беларускую літаратуру. А часам і не хочам ведаць, бо яны нам здаюцца не вартымі ўвагі. Пасля засваення школьнай праграмы айчынныя класікі ўяўляюцца многім нейкімі дзівакамі не ад гэтага свету, якія ў вышыванках брыдуць па полі за драўлянай сахою, думаючы выключна пра тое, як бы палепшыць жыццё цёмнага мужыка... Ну і каму гэта цяпер цікава?

Хаця насамрэч у іх былі такія лёсы, што не трэба нічога і выдумляць — бяры ды пішы эпічны раман ці сцэнарый для серыяла. Прычым у ім будуць спалучацца самыя розныя жанры — і меладрама, і камедыя, і дэтэктыў. Даю гарантыі — гледачы не занудзяцца!

Тым болей, параўнальна з жыццём Вінцэнта-Якуба Марцінкевіча, пры жыцці больш вядомага як Вікенцій Дунін-Марцінкевіч (яго падвойнае прозвішча — гэта адмысловая гісторыя) і яго сваякоў многія выдуманыя серыяльнымі сцэнарыстамі гісторыі пададуцца бляклымі.

ШЧАСЛІВЫ БІЛЕТ ЯНА

Што ж у першую чаргу ўспамінаецца са школьнай праграмы пра пачынальніка новай беларускай літаратуры? Яго беднае сіроцкае і нават напаўгалоднае дзяцінства. Але сёння мы можам сцвярджаць: сіратой ён не быў. Яго маці памерла ў фальварку Юзафова 20 чэрвеня 1830 года ва ўзросце 62 гады. Вікенцію тады ўжо ішоў 23-ці год. Пахаваная яна на каталіцкіх могілках у Глуску. Ды і грошай ёй хапала не толькі на ежу, але і на тое, каб даваць іх у пазыку суседзям.

А вось бацька сапраўды памёр, калі Вікенцію было ўсяго 3 месяцы. Што мы ведаем пра Яна Марцінкевіча? Перад вачыма малюецца збяднелы шляхціц, які ў сялянскай вопратцы арэ арандаваную зямлю ў Панюшкавічах, час ад часу прамаўляючы народныя мудрасці кшталту "Гаспадарку весці — галавой і кішэняй трэсці".

Але я быў бы схільны пачаць стужку пра сям'ю Марцінкевічаў зусім з іншых краявідаў — з бліскучых сталіц: Вільні і Санкт-Пецярбурга. Бо менавіта з імі і звязана большая частка жыцця, а знакамітыя Панюшкавічы — усяго толькі выпадковы эпізод у іх біяграфіі і нават геаграфіі. Увогуле, на карту Беларусі мы можам нанесці з дзясятак новых месцаў, звязаных з гэтым родам.

Справа ў тым, што Яну Марцінкевічу удалося выцягнуць шчаслівы білет. На пачатку 1770-х ён ажаніўся з Людовікай Рыкачэўскай — дзяўчынай, дзядзька якой неўзабаве стане адным з найуплывовых людзей велізарнай імперыі — мітрапаліта ўсіх рымска-каталіцкіх касцёлаў Расіі. Тады, у момант жаніцьбы, ніхто не мог прадбачыць такі ўзлёт кар'еры Станіслава Богуша-Сестранцэвіча — на той час сціплага каноніка (памочнік біскупа Ігнація Масальскага) у Віленскім кафедральным капітуле.

Але тое, што ад беднасці яго шматлікія сваякі не пакутавалі — гэта 1000 працэнтаў. Прыкладам, Станіслаў падарыў сваёй сястры Ганне Рыкачэўскай — маці Людовікі — камяніцу ў адным з найпрэстыжных раёнаў Вільні — на вуліцы Субач, у сотні метраў ад знакамітай Вострай брамы, побач з палацамі наймагутных родаў ВКЛ.

Менавіта ў Вільні каля 1772 года нарадзіўся старэйшы сын Яна і Людовікі Марцінкевічаў — Ігнат, там жа з'явілася на свет яго дачка Францішка. Хутчэй за ўсё, у сталіцы ВКЛ сям'я правяла цэлае дзесяцігоддзе, — пакуль у 1780 годзе яна не прадала свой дом Пятру Макржэцкаму за 2400 злотых. Прыстойная па тых часах сума. І будзь у бацькі класіка мара аб сваім "лапіку зямлі", ён бы дакладна мог сабе дазволіць яе ўрэчаіснець.

Але патрэбы такой не ўзнікала. Змена месца жыхарства была звязаная з тым, што ў 1778 год Богуш-Сестранцэвіч набыў у ваяводы Лапацінскага маёнткі Маляцічы (цяпер у Крычаўскім раёне) і Лапацін (у Мсціслаўскім). У Лапаціне 30 мая 1781 года нарадзіўся, а 2 чэрвеня быў ахрышчаны толькі вадой у Маляцічскім касцёле сын Яна і Людовікі Фелікс Станіслаў Казімір. На жаль, дзіця не пражыло доўга і памерла 22 жніўня.

У Вільні Марцінкевічы жылі ў двух кроках ад аднаго з самых прыгожых сталічных храмаў – касцёла святога Казіміра.

Перад шлюбам з княгіняй Канцямір Ігнат Марцінкевіч мусіў даць распіску аб тым, што не будзе навяртаць яе ў каталіцтва. Дакумент стаў важнай крыніцай звестак пра яго род.

Падобна на тое, што ў гэтым маёнтку сям'я Марцінкевічаў пражыла больш за дзесяць гадоў — і жылося ім там, мабыць, зусім няблага. Ажно пакуль не адышла ў лепшы свет Людовіка — хутчэй за ўсё, менавіта ў Лапаціне.

Неўзабаве Ян ажаніўся другі раз, яго жонкай стала Марцыяна з Нядзвецкіх — будучая маці Вінцэнта. Перад тым, як апынуцца ў Панюшкавічах, новая сям'я не раз мяняла месца жыхарства. Дарэчы, і наконт гэтага вядомага маёнтка, які стаў месцам нараджэння Вікенція, часта паўтараецца памылка: многія пішуць, што ён належаў Сестранцэвічу. Насамрэч, гэта не зусім так: маёнтак уваходзіў у склад Бабруйскай бенефіцыі і аддаваўся святару толькі на час яго службы.

Пасля смерці мітрапаліта Панюшкавічы перайшлі да мінскага біскупа Ліпскага. А вось уласныя маёнткі Богуш-Сестранцэвіча — Лапаціна і Маляцічы — сталі прадметам доўгіх спрэчак паміж спадкаемцамі, у лік якіх уваходзілі пляменнікі мітрапаліта Ігнат і Францішка Марцінкевічы.

УЛЮБЁНЕЦ КНЯЗЁЎНАЎ

Ігнату, адзінакроўнаму брату Вікенція, варта прысвяціць асобную лінію ў нашым аповедзе. Для пачатку звернем увагу на тое, што ён быў старэйшым за Вінцэнта больш, чым на 35 гадоў!

Дый нават ягонай маці прыходзіўся амаль равеснікам. Зрэшты, у той час мезальянс быў справай даволі звыклай.

Дык вось, Ігнат даволі хутка зрабіў ваенную кар'еру — дакладней, ваенна-марскую. І гэтаксама хутка яе загубіў. Пачаўшы з гардэмарына, ён даслужыўся да капітана-лейтэнанта, прайшоў не адно мора і не адну бітву. А загубілі яго справы гаспадарчыя.

Як і яго бацьку, імпэтнаму марскому афіцэру шчасціла і на асабістым фронце. Ігнат быў жанаты двойчы — і абодва разы на князёўнах. І ў святле гэтых сямейных сувязяў наўрад ці можна ўявіць Яна Марцінкевіча ў традыцыйным для беларускай гісторыі літаратуры выглядзе: у лапцях ды з сахой.

Як мы ўжо распавядалі на старонках "К", першай яго жонкай стала дачка князя Дзмітрыя Канцяміра Соф'я. Цесць Ігната Марцінкевіча быў казачна багатым, сваяцкія сувязі знітоўвалі яго з самымі ўплывовымі родамі Расійскай імперыі. Да ўсяго, менавіта ён лічыўся спадчыннікам малдаўскага прастолу!

Аднак у 1811 годзе кар'ера афіцэра абарвалася. Ігната абвінавацілі ў растраце дзяржаўных сродкаў у асабліва буйных памерах пры пабудове 18 кананірскіх лодак.

Ён быў прысуджаны да растрэлу і цэлы месяц правёў паміж жыццём і смерцю. 24 мая найвышэйшая судова-крымінальная інстанцыя ваеннага ведамства — Генерал-аўдатарыят — пастанавіла: пазбавіўшы Марцінкевіча ўсіх чыноў і ордэнаў, запісаць у матросы з аддачай усіх даўгоў. І такі прысуд здаваўся яшчэ мяккім!

Ашаламляльныя падрабязнасці гэтай справы, якая каштавала Ігнату Марцінкевічу свабоды, рэпутацыі, афіцэрскага звання, маёмасці і ледзь не пазбавіла яго жыцця, мы распавядзем у наступнай серыі фамільнай сагі. Пакуль жа адзначым толькі адно: нашаму герою ізноў неверагодна пашчасціла! Для кагосьці іншага такі піруэт лёсу мог бы стацца фатальным. А вось былы марскі афіцэр страціў усё – апрача сілы духа і, трэба меркаваць, абаяльнасці. Іначай як патлумачыць наступны эпізод біяграфіі ўжо амаль пяцідзесяцігадовага мужчыны?

У 1821 годзе Ігнат ажаніўся другі раз — прычым ізноў на князёўне! Лізавета Валконская прыналежыла да аднаго з самых знакамітых родаў імперыі, які выводзіў сваю генеалогію яшчэ ад Рурыкавічаў!

Адзначым, што абедзве жонкі Ігната Марцінкевіча былі праваслаўнымі, а ў тагачаснай Расіі міжканфесійны шлюб накладваў пэўныя абмежаванні. Дзеці маглі быць ахрышчаны толькі ў праваслаўе, пра што сам Ігнат перад шлюбам даў афіцыйную распіску. Зрэшты, пра дзяцей ад першага шлюбу нам нічога невядома.

Сыны Ігната ад другога шлюбу жылі ў Санкт-Пецярбургу, дзе ў іх быў свой дом, які застаўся пасля мітрапаліта, а таксама ў прыстойных па сваіх памерах маёнтках князёў Валконскіх у Лугскім павеце. Дарэчы, адзін з нашчадкаў Ігната Дуніна-Марцінкевіча — Сяргей Міхайлавіч — пасля рэвалюцыі, падобна, адрокся ад "чужароднага" падвойнага прозвішча. Прычым зрабіў гэта дзіўным чынам — стаў проста Дуніным. Быў ён літаратарам, працаваў у ленінградскіх газетах.

Зміцер ДРОЗД,
гісторык-архівіст

Дарэчы

Яшчэ болей нечаканых фактаў з біяграфіі класіка і гісторыі яго роду можна даведацца з кнігі "Таямніцы Дуніна-Марцінкевіча", падрыхтаванай Змітром Драздом, у тым ліку, і на аснове публікацый у "К".

Працяг —
у наступных нумарах "К".

Словы пра пісьменніка Уладзіміра Караткевіча

Чарговы герой цыкла сяброўскіх нарысаў Адама Глобуса — асоба легендарная. На дзіва для многіх, яе партрэт атрымаўся зусім непарадным, не для школьнага падручніка. Але кожны яго штрых прасякнуты шчырай любоўю да колішняга суседа і старэйшага таварыша "дзядзькі Валодзі".



ПЕРШЫ ПОДЗВІГ

Добра, калі герой, якога ты старанна апісваеш, здатны здзейсніць подзвіг. Большасць герояў, апісаных Караткевічам, ішлі і рабілі самаахвярныя подзвігі. Нават у аўтабіяграфіі Уладзімір Караткевіч знайшоў месца для аднаго подзвігу. "...“Непісьменным” сябе не памятаю. Маці кажа, што чытаць, непрыкметна для іншых, навучыўся ў тры з паловаю гады, а пісаць трохі пазней. І, здаецца, гэта быў першы і апошні мой подзвіг" — так апісаў класік сваё вундэркідства ў "Дарозе, якую прайшоў". Аўтабіяграфія пісалася ў 1964 годзе. Наперадзе было дваццаць гадоў жыцця і працы, дваццаць гадоў самаахвярнай працы дзеля літаратуры, дзеля беларусаў і Беларусі, дваццаць гадоў суцэльнага подзвігу.

ЛЮБІМЫЯ ЖАНЧЫНЫ

Казаць пра чужых жанчын, пра чужых жонак і каханак складана і рызыкоўна. Яшчэ больш складана расказваць пра любімых жанчын такога вядомага чалавека, як Уладзімір Караткевіч. Але ўсё ж паспрабую, бо некалькі разоў чуў нахабную хлусню на гэтую тэму. Ілгалі людзі вядомыя. Казалі пра донжуанства Караткевіча, якога, на мой погляд, было досыць мала. Людзі падманвалі і не чырванелі, што для мяне і не дзіўна.

Цяпер да праўды...

У дзядзькі Валодзі было пяць самых любімых жанчын, якія адыгралі ў ягоным жыцці вялікую ролю.

Найперш гэта маці — Надзея Васільеўна. Валодзя Караткевіч усё жыццё заставаўся такім сабе маміным сынком. Любіў яе пяшчотна і вельмі цяжка перажываў ейную смерць.

Другая жанчына, якая моцна паўплывала на Караткевіча — Ніна Молева. Яна выкладала гісторыю мастацтва ў маскоўскім літаратурным інстытуце. Караткевіч яе кахаў. Прысвячаў ёй вершы. Нават раман напісаў пра сваё вялікае каханне — "Нельга забыць".

Трэцяя муза Уладзіміра Караткевіча — Валя, ягоная жонка. Яна натхняла пісаць запатрабаваную чытачамі прозу ў форме вострасюжэтнага дэтэктыва.

Дабрабыт і фінансы Караткевіча моцна залежалі ад ягонай маскоўскай перакладчыцы і сяброўкі — Валянціны Шчадрыной. Яна шмат паспрыяла поспеху Караткевіча ў розных савецкіх і замежных выдавецтвах. Кажучы кіношнай моваю, яна была ягоным прадзюсарам.

Калі Караткевіч згубіў маці і жонку, ім апекавалася сястра — Наталля. Гэтыя пяць разумных жанчын зрабілі ўсё, каб беларуская літаратура займела яшчэ аднаго класіка — Уладзіміра Караткевіча.

ДОМ, ДВОР І СМЕЦЦЕВОЗКА

Цяпер можна пражыць у мінскім шматпавярховым доме гадоў дзесяць і не ведаць у твар усіх суседзяў па лесвічнай пляцоўцы. Нашае сталічнае жыццё робіцца ўсё больш замкнёным і нават герметычным. Ты існуеш у эгаістычным свеце, і суіснаванне пад адным дахам мала чым аб'ядноўвае людзей, бо ў нас больш няма аніякай агульнай штодзённай справы.

Калі я з бацькамі жыў на вуліцы Чарнышэўскага ў блочным пяціпавярховіку, дык усіх жыхароў нашай светла-шэрай новенькай "хрушчобы" аб'ядноўвала цёмна-шэрая смеццевозка. Яна прыязджала ў двор раз на дзень, і мы з вёдрамі, поўнымі розных маляўнічых адкідаў, выстройваліся ў стракатую чаргу. У гэтай чарзе я бачыў найлепшых беларускіх пісьменнікаў Уладзіміра Караткевіча і Міхася Стральцова, бачыў там празаіка Пташнікава і паэта з узвышэнцаў — Язэпа Пушчу, бачыў драматурга Махнача і доктара Алешку, быў там перакладчык Хаім Мальцінскі і дзіцячы паэт Авер'ян Дзеружынскі, быў паэт Нядзведскі і была паэтка Еўдакія Лось, быў будучы фантаст Падбярэзскі і будучы спявак з "Песняроў" Кашапараў...

Заўсёды нехта з суседзяў спяшаўся на працу, і мне даводзілася выкідаць не толькі сваё, але і чужое смецце. Чаканне смеццевозкі праходзіла весела. Добра запомнілася, што больш за ўсіх весяліўся і весяліў іншых Караткевіч. Мужчынам ён апавядаў гучным — на ўвесь двор — голасам салёныя анекдоты. Жанчынам казаў салодкія камплімэнты. Дзяцей спрабаваў напужаць нейкімі старымі школьнымі страшылкамі пра вялізнага сабаку з вогненнымі вачыма...

Неўзабаве з пяціпавярховай "хрушчобы" наша сям'я пераехала ў дзевяціпавярховік са смецціправодам, і вясёлыя чаканні смеццевозкі засталіся ў мінулым.

БАРАДУЛІН І БАЙКІ

У Рыгора Барадуліна была нейкая малавытлумачальная рэўнасць да ўсіх, хто сябраваў ці быў папросту блізкі з Караткевічам. Пра ўсіх набліжаных да дзядзькі Валодзі людзей Рыгор Іванавіч распаўсюджваў розныя байкі. Казаў, што жонку Валянціну Караткевічу падсунулі "там, дзе трэба".

Ведаючы схільнасць Барадуліна да рызыкоўных жартаў, я не аспрэчваў і не каментаваў яго меркаванне пра цётку Валю. Не каментаваў, бо думаў, што, калі б Барадулін быў жанчынай, ён не толькі "ажаніў" бы на сабе Караткевіча, але і прымусіў бы яго кінуць піць і курыць.



Уладзімір Караткевіч. "Велікодная паштоўка". 1978 год. Папера, чарнільная асадка, каляровыя алоўкі. 73х160 мм. Друкуецца ўпершыню.

Каментарый Адама Глобуса: "На паштоўцы намаляваная наша сям'я ў выглядзе куранятак. Кураня з пэндзлікам і чырвонай каробкаю — я. Маленечкае кураня — мой брат Мірык. Кураня з сінім яйкам — наша маці Ніна Глобус. Кураня з кнігай — наш тата Вячаслаў Адамчык".



ЧЭХАЎ І ЦЯГНІК

Мой даўні знаёмы Алесь напісаў у дзённіку, што моцна не задаволены "Аўстрыйскімі авіялініямі", бо ў венскім аэрапорце давялося лішнія дзве гадзіны чакаць пасадкі. Звычайны побытавы запіс мяне здзівіў тым, што яго напісаў менавіта Алесь, які ў цяжкіх умовах адсядзеў у турме некалькі гадоў. Прачытаўшы пра абурэнне авіялініямі, я згадаў дзядзьку Валодзю Караткевіча з ягоным любімым назіраннем са спадчыны доктара Антона Чэхава: лепей дзве гадзіны ў далёкім стэпу пад снегам і ветрам чакаць на маленечкай чыгуначнай станцыі цягнік, чым пяць хвілін дома ў цяпле і на канапе чакаць першую чарку гарэлкі.

БАРАДУЛІН, НЯДЗВЕДСКІ І СМЕРЦЬ

Рыгор Барадулін пачуў, як мы — зусім зялёныя паэты-пачаткоўцы — смяемся са смерці старога выдавецкага графамана. Барадулін не стаў казаць добрыя словы пра графамана, ён расказаў, што ў маладосці разам з Караткевічам і Стральцовым таксама пасміхаўся са смерці старых дурняў. Так было, пакуль не памёр Уладзіслаў Нядзведскі. "Мы працверазелі і зразумелі, што заўтра-пазаўтра прыйдзе і наша чарга выпраўляцца ў лепшы свет. Чаму гэта адбылося менавіта на пахаванні Нядзведскага? Каб жа хто ведаў? Мусіць, з-за таго, што мы ўсе з ім шмат пілі і шмат смяяліся над магіламі кепскіх паэтаў. І з вамі здарыцца нешта падобнае, і вас чакае пахаванне свайго Нядзведскага..."

Прароцтва Барадуліна ўражвала, бо я выдатна помніў вечна захмялелага паэта Нядзведскага. Ён быў падобны на кінематаграфічнага верхаводу з італа-амерыканскай мафіі, такі сабе Аль Капонэ. Уладзіславу далося ў знакі цяжкае маленства, якое прайшло ў дзіцячым доме. Ён мог за сябе пастаяць у бойцы, але супраць выпіўкі быў зусім слабы.

У нашым літаратурным двары на вуліцы Чарнышэўскага Нядзведскі першы купіў свайму сыну хулахуп. Хлопчык выдатна круціў на таліі вялікі пластыкавы абруч. Двор быў у захапленні. Паэзію Уладзіслава Нядзведскага я, прызнаюся, ведаю кепска, бо ніколі не захапляўся савецкімі газетнымі рыфмаванкамі. Але, каб расказаць пра прароцтва Барадуліна пераканаўча, без паэтычнай цытаты не абысціся. Таму я пашукаў і выбраў чатыры радкі з першай кнігі Уладзіслава Язэпавіча Нядзведскага "Вясновыя барозны":

Над полем і абалоннем
Туман белаваты вісне,
Такі, што вазьмі
ў далоні —
І шклянку вады
націснеш...

Маё пакаленне паэтаў перастала жартаваць і смяяцца над трунамі графаманаў пасля смерці Анатоля Сыса.

САМАСПАЛЕННЕ

Караткевіч спаліў сябе гарэлкай. Шмат хто з нашых паэтаў спальваў сябе алкаголем. Сцяпан Гаўрусёў, Яўген Крупенька, Валодзя Марук, Рыгор Семашкевіч, Міхась Стральцоў, Толя Сыс, Мікола Федзюковіч, Мікола Купрэеў... Пра кожнага з іх і шмат пра каго іншага з беларускіх паэтаў можна сказаць нешта падобнае, але сфармуляваўся гэткі змрочны сказ тады, калі я з сумам згадаў апошнія дні Уладзіміра Караткевіча. Ён сам сябе спаліў...

Адам ГЛОБУС,
мастак, літаратар

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
- "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.";
- "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.";
- "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.";
- "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.";
- "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.";
- "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".

Выставы:
- Выставачны праект **"Святыя непадзеленай Царквы"** — да 20 лютага.
- Выстава **"Леанід Шчамялёў. Жывапіс"** (да 95-годдзя з дня нараджэння народнага мастака Беларусі) — да 18 лютага.
- Выстава **"Паэтыка пейзажаў Сямёна Дамарада"** — да 11 лютага.
- Выстава **"Айчыне служым!"** (да 100-годдзя Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь) — да 15 мая.
- Выстава Вольгі Угрыновіч **"У сутворчасці з прыродай"** (фарфор, жывапіс) — да 4 сакавіка ў арт-кафэ музея.
- Віртуальная выстава **"Настальгія па зіме. Сем зімовых пейзажаў Абрама Кроля"**.

Філіялы музея

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX ст."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:
- **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
- **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
- **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.
- Выстава акварэлі Ларысы Стрыжак і Наталлі Харольскай **"Мы любім кветкі..."** — да 15 лютага.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстава **"Жаночы сусвет"** — да 11 сакавіка.
- Лекторый **"За кубачкам гарбаты"** (серыя інтэрактыўных лекцый пра чатыры віды народнай творчасці).

10 лютага — "Драўляная скульптура і народны жывапіс", 17 лютага — "Саломапляценне". Пачатак лекцый а 12-й.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:
- Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
- "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
- Бестэрміновая акцыя **"Адзіны білет"**, якая дазваляе мінчанам і гасцям сталіцы наведаць музей і яго шэсць філіялаў, набыўшы ўсяго адзін білет у любым з іх.
- Аўтарскі праект Ахрэма Белабровіка **VKL3D**.
- Акцыя **"Вольнае пяніна"** — кожны дзень з 16.00 да 19.00.

Выставы:
- Выстава **"Беларусь: адраджэнне духоўнасці"**.
- Выстава **"Ад рымскага дэнарыя да беларускага рубля"**.
- Часовая экспазіцыя **"Традыцыйная мастацкая культура Беларусі"** — да 25 лютага.
- Выстава **"Great Britain"** (сумесны адукацыйны праект мастачкі Антаніны Петрыкоўскай і музея) — да 18 лютага.
- Выстава жывапісу Ганны Конанавай **"Сонечная вяршыня"** — да 25 лютага.
- Выстава твораў Настассі Балыш **"Таямніцы святла"** — да 17 лютага ў музейнай прасторы "Галерэя".

У МІНСКУ ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" МОЖНА НАБЫЦЬ У НАСТУПНЫХ КРОПКАХ:

МАГАЗІНЫ "БЕЛСАЮЗДРУК"
- **Падземны пераход ст.м. "Пятроўшчына".**
- **Падземны пераход ст.м. "Плошча Перамогі".**
- **Праспект Незалежнасці, 44.**
- **Вуліца Валадарскага, 16.**

КІЁСКІ "БЕЛСАЮЗДРУК"
- **ст.м. "Няміга", вул. М. Багдановіча.**
- **Праспект Пераможцаў, 5.**
- **Вуліца Рабкораўская, 17.**
- **Праспект Незалежнасці,168, В.**
- **Вуліца Лабанка, 2.**

Філіялы музея

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.
- **Абноўленая экспазіцыя**, прымеркаваная да 100–годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі (залы дапоўненыя новымі прадметамі амаль з усіх фондавых калекцый музея).
- Экспазіцыйны праект **"Мінск 1917"**, прысвечаны гісторыі горада ў рэвалюцыйны 1917 год — да 11 сакавіка.
- Аўтарская выстава фатаграфіі А.Лінэмана **"13-е Акно"** — да 25 лютага.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 11.
- Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 06 33.

Экспазіцыі:
- "Сезонныя змены".
- "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
- "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
- "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
- "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
- **Жывыя цмокі"** — да 25 лютага.

г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон").
Тэл.: +37529 123 60 53.
- Выстава **"Сафары парк"**.
- Атракцыён **"Стужачны лабірынт"**.
- Атракцыён **"Лазерны квэст"**.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ
г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:
- "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях"; "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст."; "Беларуская музычная культура XX ст."; "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".
- Выстава **"Легенда беларускай оперы"** — да 11 лютага.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА
г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.
- Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:
- Музейныя заняткі **"Тэатральная лялька"** для дзяцей 5+.
- Інтэрактыўныя музейныя заняткі **"Асновы акцёрскага майстэрства"** для дзяцей ад 5 да 10 гадоў.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО
г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.
- Пастаянная экспазіцыя.
- **"Асаблівая фатаграфія"** (першая выстава Секцыі аналагавай фатаграфіі Беларускага аб'яднання фатографаў) — да 18 лютага.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе: пн. — выхадны, аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й, сер. — ад 12-й да 20-й.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Часовая экспазіцыя **"Пётр Машэраў: яго сэрца білася для людзей"** — з 13 лютага да 13 жніўня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; +37529 551 80 51, + 37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль
- Пастаянная экспазіцыя.
- Гістарычны квэст **"Таямніцы і загадкі палаца Радзівілаў"**. Па папярэдніх заяўках.

Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці
Вул. Гейсіка, 1.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстава **"Дуэт"** з калекцый майстроў выцінанкі Алены Шаліма і Наталлі Гамаюнавай.

Ратуша Вул. Савецкая, 3.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Квэст **"Выхадкі старога захавальніка"**. Па папярэдніх заяўках.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Міжнародная перасоўная выстава **"Лагер смерці Трасцянец. Гісторыя і памяць"** — да 25 лютага.
- Тэатралізаваная экскурсія **"І зноў ажываюць паданні"**.
- Экскурсія з элементамі дэгустацыі **"У госці да Пане Каханку"**.
- Дзіцячая тэатралізаваная экскурсія **"Чароўная гісторыя ў Мірскім замку"**.
- Музейныя заняткі.
- Музейная фотапляцоўка.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА
г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:
- **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
- Экспазіцыя **"Склеп"** на сядзібе Якуба Коласа.
- Тэматычныя экскурсіі і лекцыйныя заняткі.
- Тэатралізаваныя прадстаўленні паводле беларускіх народных казак.
- Музейныя майстар-класы і заняткі.
- Мультымедыйны комплекс **"Чалавек. Асоба. Час"**.
- Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"**.
- Інтэрактыўныя праграмы для сямейных наведвальнікаў, квэст-гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
- Выстава **"Жывыя малюнкі, вобразы, сімвалы..."** (да 90-годдзя з дня нараджэння народнага мастака Беларусі Уладзіміра Стэльмашонка) — да 6 сакавіка.
- Выстава твораў Эдуарда Мацюшонка **"Адчуванне сябе..."** — да 28 лютага.

Акцыі:
- Online-акцыя **"Закаханыя ў Коласа"** — да 14 лютага.
- **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
- Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"**

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ
г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:
- Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
- Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"**.
- Выстава **"Yiwarra Kuju — маршрут Кэнінга: мастацтва абарыгенаў пустыні Заходняй Аўстраліі"** — да 14 лютага.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
- **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва"**.
- Выстава жывапісу і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва **"Familia"** (прысвечана 95-годдзю Леаніда Шчамялёва) — да 11 сакавіка.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА
г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
- **"Мастак. Грамадзянін. Герой"**. Прысвечана Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
- **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт"**.
- Выстава **"Мастак і Чалавек"** — да 11 лютага.
- Выстава **"Мастацкая школа імя Яна Разэнталя"** — з 13 лютага да 4 сакавіка.
- Выстава **"Леў Барадулін. Легенда спартыўнай фатаграфіі"** — да 25 лютага.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША
г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
- **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет"**.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.
- Пастаянная экспазіцыя.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:
- **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 8. Тэл.: 321 24 30.
- **"Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж"** (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
- Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "МІНСКАЯ КОННАЯ ЧЫГУНКА"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6.
- Экспазіцыя складаецца з некалькіх раздзелаў, якія распавядаюць пра жыццё Мінска 1890 — 1920-х гг.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЬСТА"
г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
- Выстава мастацкага тэкстылю і касцюма **"Гіперсувязі"** студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў — да 25 лютага.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ
г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

Пастаянныя экспазіцыі:
- **"Прырода Лідчыны"**.
- **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).

Выставы:
- Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**.
- **"Вядзем пачатак мы ад Гедыміна..."**.
- Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
- Выстава са збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
- Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
- Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**.
- Выстава **"Надзейны шчыт краіны"**.
- Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.
- Выстава **"Жыве мая ліра нанова!"**

НАВАГРУДСКІ ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ
г.Навагрудак, вул. Гродзенская, 2. тэл. (8-01597) 2 14 70.
- Пастаянная экспазіцыя: **"Гісторыя Навагрудчыны са старажытных часоў да Вялікай Айчыннай вайны"**.

г.Навагрудак, вул.Мінская, 64-66.
- Экспазіцыя: **"Музей яўрэйскага супраціўлення ў Навагрудку"**.

ДОМ-МУЗЕЙ АДАМА МІЦКЕВІЧА Ў НАВАГРУДКУ
г. Навагрудак, вул. Леніна,1.
Тэл.: (8-01597) 2 43 40 (каса).
- Пастаянная экспазіцыя: **"Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча"**.
- Пастаянныя выставы: **"Святло кухні Міцкевічаў", "Малюнкі сельскага жыцця", "Пан Тадэвуш" праз час і народы"**.

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"
г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.
- Выстава твораў Аляксандра Адамава **"Азірніся на дом свой"** — да 21 лютага.
- Выстава карцін дагестанскага мастака і пісьменніка Марата Гаджыева **"Зунзул чані" ("Світанне")** — да 28 лютага.
- Выстава работ удзельнікаў Кубка Беларусі па мастацкай творчасці ў рамках II Міжнароднага фестывалю-конкурсу дзіцяча-маладзёжнай творчасці **"Асамблея мастацтваў"** — з 15 па 21 лютага.
- Выстава тэкстылю студэнтаў Латвійскай акадэміі мастацтваў — з 12 лютага.

Па пытаннях размяшчэння рэкламы ў газеце "Культура" звяртайцеся па тэлефоне + 375 17 286 07 97 і па тэлефоне/факсе +375 17 334 57 41, альбо пішыце на электронны адрас kultura@tut.by!

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.
- **10 — "Пікавая дама"** (опера ў 2-х дзеях) П.Чайкоўскага (да юбілею лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Аляксандра Касцючэнкі).
- **11, 16 — "Лебядзінае возера"** (балет у 3-х дзеях) П.Чайкоўскага. Пачатак 11 лютага — а 18-й.
- **13 — "Кармэн"** (опера ў 3-х дзеях) Ж.Бізэ.
- **14 — "Эсмеральда"** (рамантычны балет у 3-х дзеях) Ц.Пуні.
- **14 —** Канцэрт **"Серэнады начных вуліц"** (выконваюць вядучыя салісты оперы). Камерная зала імя Л.П.Александроўскай. Пачатак у 18.30.
- **15 —** Выступленне Нацыянальнага балета Марсэля з праграмай **"Корпс"** (закрыццё V Міжнароднага фестывалю "Уладзімір Співакоў запрашае").
- **17 — "Іяланта"** (опера ў 2-х дзеях) П.Чайкоўскага. Пачатак а 12-й і а 19-й.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"
г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.
- **10 — "Гісторыя двух сабак"** (спектакль для дзяцей і дарослых) Я.Конева. Пачатак аб 11-й.
- **10 — "А ці будзе заўтра" ("7 дзён без антракту")** Д.Багаслаўскага.
- **11 — "Сіндром Медэі"** (трагедыя) Ю.Чарняўскай. Прэм'ера.
- **13 — "Бетон"** (візуальная паэзія) Я.Карняга. Прэм'ера.
- **14 — "Адамавы жарты"** (камедыя) С.Навуменка.
- **15 — "Партрэт"** (трагіфарс паводле аповесці М.Гогаля).
- **16 — "Дзед"** (трагікамедыя) В.Паніна.
- **17 — "А мне не сорамна!.."** (больш чым казка) Л.Усцінава. Пачатак аб 11-й.
- **17 — "Любоў людзей"** (трылер) Д.Багаслаўскага.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"
г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
- **10 — "Вясёлы Дарафей"** (інтэрактыўная казка). Пачатак аб 11-й.
- **14 —** Праграма **"Каханне пад сакурай"** (спектакль "Чароўная зброя Кэндзо", чайная цырымонія, арыгамі, каліграфія, паэзія, прадказанні і запуск японскіх ліхтарыкаў). Пачатак а 18-й.

УВАГА!
ТУТ МАГЛА БЫЦЬ ВАША АФІША!
Звяртайцеся:
+375 17 286 07 97,
+375 17 334 57 41 (факс)
kultura@tut.by